ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 33 (5138) 20 жніўня 2021 г.

ISSN 0024-4686

16+

Цаглінкі нацыянальнага пантэона
стар. 4

Жыццёвыя дарогі і сустрэчы
стар. 10

Мастацкі почырк кінастужкі
стар. 14

Калі б камяні гаварылі…



Фота Яны Будовіч.

Крэўскі замак.

Як імгненне, мінае век чалавека. Век каменя даўжэйшы. Колькі таямніц гісторыі паведамілі б камяні Крэўскага замка, калі б маглі гаварыць? Апошнія словы князя Кейстута, праклёны сваім катам і забойцам. Пра што марыла дзяўчына, якая выратавала князя Вітаўта цаной уласнага жыцця. На якія выгоды, акрамя пазначаных у дамове, спадзяваўся Ягайла, падпісваючы унію. Зацятую рашучасць абаронцаў замка ад Свідрыгайлавых вояў, якія ўчынілі знішчальны пажар…

Маўклівае адлюстраванне сваёй эпохі, Сярэднявечча, Крэўскі замак — унікальны помнік для Беларусі, тым больш што ён не перабудоўваўся за ўсю сваю гісторыю. Узведзены пад кіраўніцтвам запрошаных Гедымінам ганзейскіх майстроў у XIV стагоддзі, замак быў рэвалюцыйным крокам таго часу. Архітэктурнае рашэнне хоць і запазычылі на Захадзе, у немцаў, але штаўпэнаўскія кастэлі мелі меншую плошчу ўнутранага двара, бо прадугледжвалі, каб у іх сценах мог схавацца толькі гарнізон. На абарону крэўскіх сцен магло разлічваць усё насельніцтва мястэчка разам з хатняй жывёлай. Тады традыцый мураванага дойлідства ў такіх маштабах не існавала…

Працяг на стар. 5 ▸

ISSN 0024-4686

9 770024 468001 21033

«ЛіМ»-акцэнты

Свята. У Капылі 4—5 верасня адбудзецца XXVIII Дзень беларускага пісьменства. У канцэпцыю свята закладзена асноўная тэма «Год народнага адзінства», якая базіруецца на знакавых для краіны падзеях і датах: 80-годдзе пачатку Вялікай Айчыннай вайны, гісторыка-культурная і духоўная спадчына Капыльшчыны (больш як 50 вядомых пісьменнікаў, прадстаўнікоў творчых прафесій — выхадцы з Капыльскага раёна), юбілеі класікаў беларускай літаратуры. Свята традыцыйна пачнецца з Рэспубліканскай навукова-асветніцкай экспедыцыі «Дарога да Святыняў», якая праходзіць пры падтрымцы Беларускай праваслаўнай царквы. Экспедыцыя выправіцца 1 верасня з Мінска і завершыцца 5 верасня ў Капылі. Адна з галоўных падзей свята — цырымонія ўзнагароджання пісьменнікаў — пераможцаў Нацыянальнай літаратурнай прэміі — пройдзе 5 верасня.

Навацыі. Аб асаблівасцях арганізацыі і правядзення XXVII Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад» расказаў журналістам генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Уладзімір Карачэўскі. «Арганізатарамі конкурсу з'яўляюцца Міністэрства культуры і Мінскі гарвыканкам, інакш кажучы, дзяржава, як і мінулыя гады, падтрымлівае гэты фестываль. Нягледзячы на пандэмію і нейкія геапалітычныя пытанні, фестывалю быць. Ён адбудзецца з 20 да 26 лістапада», — адзначыў Уладзімір Карачэўскі. Галоўным арганізатарам, падрадчыкам кінафоруму цяпер выступае Нацыянальная кінакампанія «Беларусьфільм». «Мы абапіраемся на ранейшыя напрацоўкі, працягваем найлепшыя традыцыі нашых калег. Аднак сёлета робім рэбрэндынг — будзем мяняць лагатып, уносіць змяненні ў рэгламент фестывалю», — паведаміў гендырэктар. Фестываль пашырае геаграфію. «Беларусь аб'яўляе аб сваёй адкрытай палітыцы. Нягледзячы на санкцыі, мы гатовы да дыялогу. І кіно — тое, што павінна аб'ядноўваць людзей, а не раз'ядноўваць», — пераканаў Уладзімір Карачэўскі. Да супрацоўніцтва запрашаюцца кінематаграфічныя арганізацыі з усяго свету.

Супрацоўніцтва. Тэматычную праграму «Лёсы, адлюстраваныя ў кадры» падчас правядзення III Міжнароднага фестывалю «Дні ваенна-гістарычнага кіно» прэзентуюць з 3 да 5 верасня ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, паведаміла БелТА. Гасцям мерапрыемства прапануюць агляд экспазіцыі, тэматычную экскурсію, а таксама паказ замежных фільмаў апошніх гадоў, прысвечаных Вялікай Айчыннай. За некалькі гадоў фестываль стаў узорам супрацоўніцтва дзяржавы, грамадскіх арганізацый і бізнесу. Ён праводзіцца на пляцоўках музеяў — удзельнікаў міжнароднага праекта «Тэрыторыя Перамогі» для патрыятычнага выхавання моладзі і фармаванні культурна-маральных асноў асобы.

Традыцыі. Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры запрашае 28 жніўня на чарговы «Кушлянскі фэст», які ладзіцца ў гонар аднаго з пачынальнікаў беларускай літаратуры Францішка Багушэвіча, паведамілі арганізатары. Гасцей будуць прымаць у Музеі-сядзібе Францішка Багушэвіча «Кушляны» (Смаргонскі раён Гродзенскай вобласці). Адметнасцю фэсту стануць монаспектакль «Дарожка мая» лідара этнатрыа «Троіца» Івана Кірчука і лекцыя-канцэрт Алеся Лася «Ад дуды да раяля». Гасцей свята таксама чакаюць цікавая музычная праграма з удзелам гуртоў «Явар» і «Мярэжа», разнастайныя майстар-класы, вырабы смаргонскіх умельцаў, сучасная паэзія. Для маленькіх аматараў мастацтва прапануецца пленэр. Будуць пляцоўкі аквагрыму, народныя забавы, пачастункі з зёлкавай гарбатай ад сядзібы «Дайнаўскі двор» і падарункі. Мерапрыемства ладзіцца сумесна са Смаргонскім раённым выканаўчым камітэтам.

Чытанне. Літаратурная афлайн-студыя «Кнігі, якія гавораць» пачала працаваць у Цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя К. Маркса ў Магілёве. На сайце ўстановы з'явіўся новы раздзел, дзе сабраны ўсе раней выдадзеныя аўдыякнігі мастацкіх твораў сусветна вядомых беларускіх і замежных пісьменнікаў. Прапануюцца выданні як для дарослай аўдыторыі, так і для дзяцей. Электронны фармат прадстаўленай бібліятэкі даступны для кожнага карыстальніка. Акрамя таго, тут ёсць цікавыя факты з жыцця аўтараў твораў. Як паведамілі ў кніжніцы, папаўняцца электронная бібліятэка аўдыякніг будзе штомесяц — да дня нараджэння аўтара-юбіляра. Акрамя таго, раз на тры месяцы ў межах літаратурнай студыі мяркуецца арганізоўваць тэматычныя сустрэчы і прэзентацыі новых твораў.

Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ

З пэўным крэатывам

Чым будуць здзіўляць гасцей Дня беларускага пісьменства ў Капылі, што хвалюе арганізатараў свята і чаго ўвогуле чакаць ад сёлетняй падзеі — пра гэта вялася размова падчас адмысловай прэс-канферэнцыі ў Доме прэсы.

Удзельнікі сустрэчы, у ліку якіх — намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігар Бузоўскі, начальнік упраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Міністэрства інфармацыі Уладзімір Андрыевіч, намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Анатоль Мацвіенка, дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі Іван Саверчанка, абмеркавалі і папярэднія вынікі Нацыянальнай літаратурнай прэміі.

Акрамя традыцыйных мерапрыемстваў, плануецца шэраг новых праектаў на розных пляцоўках. Арганізатары імкнуцца адлюстраваць знакавыя, аб'яднаныя пісьменніцкім словам, падзеі, гісторыка-культурную і духоўную спадчыну Капыля.

— Адкрыццё і закрыццё свята сёлета будуць неардынарнымі, з пэўным крэатывам. Адкрыццё афармяць у стылі фэнтэзі і пададуць праз пэўную нерэальнасць, таму што творчасць — гэта заўсёды палёт, фантазія таго, што чалавек хоча выказаць, — адзначыў Ігар Бузоўскі.

Ключавымі падзеямі таксама стануць перадача эстафеты гораду Добрушу — сталіцы Дня беларускага пісьменства ў 2022 годзе, цырымонія гашэння канверта з арыгінальнай маркай, прысвечанай XXVIII Дню беларускага пісьменства, адкрыццё помніка Цішку Гартнаму — ураджэнцу Капыля, пісьменніку, дзяржаўнаму і грамадскаму дзеячу, акадэміку АН БССР, а таксама адкрыццё скульптурнай кампазіцыі, прысвечанай сталіцам Дня беларускага пісьменства.

У рамках фестывалю жыхары і госці горада змогуць наведаць павільёны «Памяць», дзе прадставяць кнігі па гісторыі Беларусі, пройдуць сустрэчы з аўтарамі і навукоўцамі, і «Традыцыі і сучаснасць», дзе ў тым ліку пройдзе паказ абраду «Цары», уключанага ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА. Будуць працаваць і павільёны «Разам з кнігай мы расцём», «Слова пісьменніка», «Адзінства».

Што тычыцца Нацыянальнай літаратурнай прэміі, то, як распавёў Іван Саверчанка, старшыня журы конкурсу, сёлета на ўдзел пададзена больш за 60 работ, а на заключным этапе разглядалася 58. Пераможцы традыцыйна адбіраюцца па сямі намінацыях: «Паэзія», «Проза», «Публіцыстыка», «Крытыка і літаратуразнаўства», «Драматургія», «Кнігі для дзяцей і юнацтва», «Дэбют».

Як вядома, лаўрэат прэміі атрымлівае ўзнагароду ў памеры 100 базавых велічынь. Як падкрэсліў Ігар Бузоўскі, гэта досыць сур'ёзныя грошы для падтрымкі новых праектаў беларускіх пісьменнікаў, і кожны аўтар, які ўзнагарожваецца прэміяй, атрымлівае і пэўны пасыл да новых творчых дасягненняў.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Праблемныя кропкі вызначаны

Прымеркаваная да свята пісьменства прэс-канферэнцыя «Чытаем беларускія кнігі!» у Доме прэсы стала пляцоўкай для вызначэння праблемных кропак у працэсе развіцця беларускай кнігі.

Падчас сустрэчы пісьменнікі і прадстаўнікі Міністэрства інфармацыі і бібліятэк і абмеркавалі пытанні, звязаныя з папулярызацыяй твораў айчынных аўтараў сярод юных чытачоў.

Сярод тэм таксама былі план пашырэння сацыяльна значных, навукова-папулярных твораў, ідэя перавыдання кніг беларускіх пісьменнікаў, адаптацыя выданняў пад запыты сучаснага чытача, шляхі пераадольвання бар'еру чытання на роднай мове… Напрыканцы ўдзельнікі вызначылі напрамкі далейшай працы па папулярызацыі айчынных кніг. Да таго ж на прэс-канферэнцыі стартавала акцыя «Чытаем беларускія кнігі!» Яе вынікі будуць падведзены ў межах Дня беларускага пісьменства.

Нягледзячы на складанае эпідэміялагічнае становішча, у грамадстве не знікае цікавасць да кніг, людзі працягваюць наведваць бібліятэкі. Так, попыт на новыя выданні расце.

— За першую палову сёлетняга года кнігавыданне актывізавалася. З пачатку года ў Беларусі ўбачыла свет 4647 выданняў агульным тыражом больш як 10 млн асобнікаў. У параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года колькасць выдадзеных кніг па колькасці найменняў выросла на 19,4 %, а па тыражы — на 11,1 %, — адзначыў начальнік упраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Уладзімір Андрыевіч.

Найбольш папулярнай сярод чытачоў застаецца дзіцячая літаратура. Пра гэта сведчаць вялікія продажы такіх выданняў і значная ўвага наведвальнікаў бібліятэк. Цяпер намаганні кнігавыдаўцоў накіраваны на павелічэнне колькасці навукова-папулярнай літаратуры для школьнікаў малодшага, сярэдняга і старэйшага ўзростаў.

Між тым кожная кніжніца распрацоўвае план падтрымкі беларускага чытання, у межах якога арганізоўваюцца розныя праекты.

— Асноўная наша задача — пастаянна павялічваць цікавасць да чытання ў падрастаючага пакалення. У бібліятэках горада Мінска сфарміраваны якасны кніжны фонд, які адпавядае запыту чытачоў. У нас увесь час з'яўляюцца вартыя ўвагі выданні, — адзначыла намеснік дырэктара ДУ «Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк г. Мінска» Алена Чарняўская.

У падтрымку беларускай кнігі ў бібліятэках праводзіцца шмат імпрэз, на якія запрашаюць пісьменнікаў, арганізоўваюцца літаратурныя аб'яднанні юных чытачоў. Для рэкламы айчыннай літаратуры здымаюцца відэаролікі па кнігах і да новых паступленняў. Бібліятэкі выкарыстоўваюць усе магчымыя рэсурсы, каб прасоўваць айчынныя выданні.

Дзіяна КАЗІМІРЧЫК

дзень памяці

Часовы вандроўнік

13 жніўня 1956 года, 65 гадоў таму, пайшоў з жыцця Якуб Колас. У дзень памяці беларускага класіка Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа адкрыў экспазіцыю «Я часовы вандроўнік...».

Фота Кастуся Дробава.

Дзякуючы праекту ў наведальнікаў з'явілася мзагчымасць бліжэй пазнаёміцца з паэтам і ўбачыць яго ў больш нефармальнай атмасферы. На выстаўцы прадстаўлены чатыры фатаграфіі і адзенне з гардэроба пісьменніка. Перад гледачом, напрыклад, фатаграфія Якуба Коласа, зробленая падчас адпачынку ў Доме творчасці пісьменнікаў у Каралішчавічах. Тут творца паўстаў перад намі ў зусім нефармальным вобразе: у піжаме, тапачках, з простым кіем і ў шапцы. Унікальным можна лічыць здымак пісьменніка на беразе возера Нарач, зроблены незадоўга да смерці Якуба Коласа. Побач — адзенне, у якое ён быў апрануты ў час адпачынку.

Мемарыяльны кабінет пісьменніка, дзе праходзіла экскурсія ў дзень памяці паэта «Спяшаецца сэрца адстукаць свой пай...», застаўся такім жа, як у 1956 годзе. Тут час спыніўся разам з сэрцам беларускага класіка. Вечны панядзелак 13 жніўня. На ўсіх гадзіннікаў 13:20. Выключанае радыё, недапісанае пісьмо на працоўным стале. Экскурсія была прысвечана апошнім хвілінам жыцця пісьменніка: як вярнуўся дадому, як сеў пісаць ліст свайму сябру. Усё па секундах аж да таго моманту, як спынілася сэрца.

І роўна ў 13:20 адбылася хвіліна маўчання ў памяць вялікага паэта. А ў 14:00 прайшоў памінальны мітынг і ўскладанне кветак да помніка Якубу Коласу на Вайсковых могілках.

Алеся ЧАЧУРА

праекты

Запрашае «Беларускі салавей»

Нацыянальная бібліятэка Беларусі працягвае работу над маштабным віртуальным праектам «На хвалі часу, у плыні жыцця», прымеркаваным да 100-годдзя літаратурнага аб'яднання «Маладняк». У межах праекта на працягу трох гадоў ладзяцца розныя мерапрыемствы і ініцыятывы да юбілейных дат пісьменнікаў-маладнякоўцаў.

Летась папулярнасць набыў Рэспубліканскі анлайн-конкурс чытальнікаў «О, Беларусь, мая шыпшына», арганізаваны да 120-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Дубоўкі. Восенню бібліятэка запрашае ўсіх жадаючых узяць удзел у другім, не менш цікавым літаратурным конкурсе «Беларускі салавей», які ладзіцца да 135-годдзя Змітрака Бядулі. Інфармацыйную падтрымку забяспечваюць, газеты «Літаратура і мастацтва» і «Настаўніцкая газета», часопіс «Бярозка».

Літаратурны конкурс пройдзе з 1 да 31 кастрычніка. Удзельнікамі могуць стаць усе зацікаўленыя незалежна ад узросту. Трэба даслаць на электронную пошту *konkurs.nlb@gmail.com* невялікае эсэ (1—3 друкаваныя старонкі фармату А4) з сюжэтнай лініяй *prequel, sequel* або *spin-off* па наступных творах Змітрака Бядулі (на выбар): «Салавей», «Сярэбраная табакерка», «Бондар», «На Каляды к сыну». Удзельнік мае права прадставіць і некалькі работ пры ўмове выкарыстання сюжэтных ліній з розных вышэйпералічаных твораў пісьменніка.

Экспертнае журы конкурсу, у склад якога ўваходзяць літаратуразнаўцы, пісьменнікі і журналісты, будзе ўлічваць зыходны літаратурны матэрыял, але ад аўтараў эсэ чакаюцца арыгінальныя ідэі, стылістычная выбудаванасць і лагічнасць выкладу. Будуць ацэньвацца раскрыццё праблемы, яркасць сюжэтнай лініі ды багацце беларускай літаратурнай мовы.

Пераможцы атрымаюць памятныя дыпломы і падарункі ад партнёраў конкурсу, сярод якіх — Выдавецкі дом «Звязда», Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр юнага гледача, Вялікі тэатр Беларусі. Лаўрэатаў запросяць на выніковае мерапрыемства з экскурсіяй па Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, наведваннем музея кнігі і пад'ёмам на аглядную пляцоўку. Найлепшыя творы будуць апублікаваны ў газеце «Літаратура і мастацтва», часопісе «Бярозка», у сацыяльных сетках Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, суполцы ў *Facebook* «Маладняк — першае літаратурнае аб'яднанне Беларусі», на сайтах і ў сацыяльных сетках інфармацыйных партнёраў конкурсу.

Больш падрабязна пра літаратурны конкурс «Беларускі салавей» можна даведацца на інтэрнэт-партале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі *www.nlb.by,* на старонцы праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця», а таксама па тэлефонах: (8 017) 293 27 19, 293 29 69, 293 27 43.

Юлія АМОСАВА

«ЛіМ»-люстэрка

Фестываль беларускай песні «Наша Радзіма — Беларусь» прайшоў у эстонскім горадзе Нарва, інфармуе БелТА. Падчас музычнай сустрэчы выступілі ансамблі беларускай песні нарваўскага беларускага таварыства «Сябры», якое з'яўляецца арганізатарам фестывалю, беларускага таварыства «Лёс» (горад Талін), беларуска-эстонскага таварыства «БЭЗ» (горад Йыхві), а таксама расійскі танцавальны калектыў «Горліца». Прысутнічалі беларускія дыпламаты, кіраўніцтва і дэпутаты гарадскога сходу, прадстаўнікі нацыянальных культурных суполак Нарвы. Фестываль беларускай песні накіраваны на папулярызацыю культуры Беларусі, яе багатай спадчыны і ўмацаванне беларуска-эстонскіх сувязей у сферы культуры.

Конкурс піяністаў «Мінск-2021» пройдзе ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі з 1 да 10 снежня, паведамляецца на сайце ўстановы. У міжнародным спаборніцтве могуць удзельнічаць сольныя выканаўцы на фартэпіяна ва ўзросце ад 16 да 30 гадоў уключна. Конкурсныя праслухоўванні складаюцца з трох тураў: I і II туры адборачныя (адбудуцца ў Вялікай зале Беларускай акадэміі музыкі), III тур пройдзе ў суправаджэнні сімфанічнага аркестра ў Вялікай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі. У склад міжнароднага журы запрошаны педагогі, выбітныя майстры музычнага мастацтва Беларусі і замежных краін. Журы ацэніць выкананне канкурсантаў па дзесяцібальнай сістэме па наступных крытэрыях: яскравасць выканальніцкай індывідуальнасці; дакладнасць перадачы стылістычных асаблівасцей твораў; мастацкая завершанасць выканання; асэнсаванасць, артыстычнасць і тэхніка выканання. Арганізатары конкурсу — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Беларускі саюз музычных дзеячаў.

Міжнародны фестываль пластычных і танцавальных тэатраў «Пластформа», ужо 9-ы, пройдзе ў сталіцы з 23 жніўня да 1 верасня. Глядач зможа атрымаць асалоду не толькі ад праектаў беларускіх аўтараў, але і ад спектакляў аўстрыйскіх харэографаў, польска-беларускага праекта і творчасці артыстаў з Лівана. Акрамя тэатральнай праграмы, заяўлена адукацыйная: лекцыі, майстар-класы і псіхафізічны трэнінг, паведамляе агенцтва «Мінск-Навіны». Адкрыццё фестывалю запланавана на 27 жніўня — у гэты дзень у Мінскім Палацы культуры і спорту чыгуначнікаў пройдзе Вечар незвычайнага тэатра. Тут сыграюць спектакль «Душа» і пакажуць перформанс ад беларускіх артыстаў.

Адборачная камісія 32-га адкрытага расійскага кінафестывалю «Кінатаўр» атрымала рэкордныя 104 заяўкі ад стваральнікаў фільмаў. Яго прэзідэнт Аляксандр Раднянскі ўдакладніў, што ў конкурс сёлета трапіла крыху больш стужак, чым звычайна, — 15. «Тэматычна фільмы асноўнага конкурсу ахопліваюць некалькі эпох. Гэта тэндэнцыя, хваля — цікавасць да гісторыі краіны», — адзначыла праграмны дырэктар форуму Сітора Аліева. У асноўны конкурс увайшлі карціны «Герда» Наталлі Кудрашовай, «На блізкай адлегласці» Рыгора Дабрыгіна, «Дзень мёртвых» Віктара Рыжакова, «Адарві і выкінь» Кірыла Сакалова, «Медэя» Аляксандра Зяльдовіча, «Змоўшчыкі» Яўгена Грыгор'ева, «Нічыя» Лены Ланскіх, «Малако птушкі» Яўгена Мар'яна і іншыя. «Кінатаўр» пройдзе з 18 да 25 верасня ў Сочы, перадае «ИТАР-ТАСС».

Маскоўскі міжнародны кніжны кірмаш адбудзецца 23—26 верасня. З улікам эпідэміялагічнай абстаноўкі арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы і правядзенні 34-га кніжнага кірмашу прыняў рашэнне перанесці традыцыйныя тэрміны мерапрыемства: раней яго планавалі на 8—12 верасня. Вочнае праграма запатрабуе выканання жорсткіх супрацьэпідэмічных патрабаванняў. «Мы лічым, што гэта не складзе сур'ёзных перашкод для зносін, доўгачаканых сустрэч чытачоў з пісьменнікамі, мастакамі, выдаўцамі, журналістамі і папулярызатарамі навукі», — адзначылі ў аргкамітэце. Як інфармуе «ИТАР-ТАСС», Маскоўскі кірмаш з'яўляецца найбуйнейшым кніжным форумам у Расіі і Усходняй Еўропе. Праект арганізаваны генеральнай дырэкцыяй міжнародных кніжных выставак і кірмашоў пры падтрымцы Расійскага кніжнага саюза і ўрада Масквы.

Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

юбілеі

Імя ў айчыннай літаратуры

Прэзідыум Саюза пісьменнікаў Беларусі павіншаваў нашага калегу, рэдактара аддзела газеты «Літаратура і мастацтва» Алеся Марціновіча з юбілеем.

Гэтымі днямі Алесь Андрэевіч адзначае 75-годдзе. Як падкрэслілі у СПБ, за працяглы час сваёй літаратурнай дзейнасці ён стаў знакамітым творцам, імя якога добра вядома ў айчыннай літаратуры.

«Вы заслужылі павагу сваім захапленнем гістарычнай тэматыкай. Створаныя вамі рамантычныя вобразы, з невядомымі для чытача фактамі з жыцця знакамітых асоб Беларусі, сведчаць аб вялікай духоўнасці нашай нацыі, яе багатым мінулым, якое вы творча спалучаеце з сучасным і будучым нашай краіны, — гаворыцца ў віншаванні. — Ваша дзейнасць у ролі крытыка, публіцыста прыцягвае ўвагу да вашых артыкулаў шматлікіх пісьменнікаў і чытачоў. Як глыбокі знаўца літаратуры, вы праяўляеце талент аналітыка літаратурных працэсаў, умела ацэньваеце значнасць твораў, згадваеце пра іх уплыў на духоўнасць грамадства».

Калегі і сябры ведаюць Алеся Марціновіча як добразычлівага чалавека, здольнага на вясёлыя жарты, багатага на розныя цікавыя гісторыі.

Матэрыял пра юбіляра чытайце на стар. 10

перспектывы

Хваля новых ідэй

«Беларускі кінематограф: залаты фонд айчыннага кіно і прэм'еры, якія маюць адбыцца» — пад такой назвай у Доме прэсы адбылася прэс-канферэнцыя, у якой узялі ўдзел вядучы спецыяліст прадзюсарскага цэнтра Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Юрый Ігруша і мастак-пастаноўшчык і дэкаратар кінастудыі Іван Рагацень.

Мастак, чыя фільмаграфія налічвае больш як 30 карцін, распавёў пра творчы шлях і падрыхтоўку персанальнай выстаўкі ў гонар свайго 75-гадовага юбілею. З 10 жніўня выстаўка працуе ў Музеі гісторыі беларускага кіно.

Цікава было даведацца і пра сённяшнія дасягненні і шматлікія новыя праекты кінастудыі «Беларусьфільм», якія ўзнавіліся пасля працяглага перапынку з-за пандэміі каранавіруса.

— Вясной адбылася прэм'ера анімацыйнага мюзікла рэжысёра Алены Туравай «Зоркі 7-га неба», — распавёў Юрый Ігруша. — Фільм дэманстраваўся ў кінатэатрах Беларусі, а цяпер дубліруецца на іншыя мовы, бо запланаваны яго пракат і за мяжой. Адбылася папярэдняя прэзентацыя таксама анімацыйнага фільма «263 ночы». У стварэнні ўдзельнічалі Беларусь, Ізраіль і Расія. Ён зняты ў незвычайным жанры «анімадок» (дакументальная гісторыя, расказаная сродкамі анімацыі). Стужка дэманстравалася ў музеі Халакосту ў Іерусаліме і была высока ацэнена гледачамі. Рыхтуецца да выпуску беларускамоўная версія фільма «Авантуры Пранціша Вырвіча», які спачатку быў зроблены на рускай мове. Абедзве версіі павінны выйсці ў пракат восенню.

Заканчваюцца здымкі фільма «Сляды апосталаў — 2» рэжысёра Сяргея Талыбы. Праектам ужо зацікавіліся замежныя каналы, у прыватнасці Расіі і Украіны. На тэлеканале «СТВ» у хуткім часе выйдзе моладзевы сіткам «Ілюзіі» рэжысёра Івана Паўлава. Акрамя таго, творца сумесна з Міністэрствам абароны рэалізуе 8-серыйны праект «Полымя пад попелам» — пасляваенная гісторыя пра беларускіх сапёраў. Скончыў сваю здымачную і мантажную работу над міні-серыялам «У пошуках анёла» рэжысёр Ігар Чацверыкоў. Фільм плануецца да паказу ў найбліжэйшы час.

Юрый Ігруша расказаў таксама і пра планы арганізацыі рэтраспектыўных паказаў да шматлікіх юбілейных дат. Так, да Дня кіно з нагоды 50-годдзя беларускай анімацыі плануецца паказаць вялікую калекцыю мультыплікацыйных фільмаў, да 85-годдзя рэжысёра Віктара Турава — рэтраспектыву яго фільмаў у кінатэатрах па ўсёй краіне. Да 100-гадовых юбілеяў Івана Шамякіна і Івана Мележа рыхтуюцца паказы фільмаў, знятых па творах пісьменнікаў. Гэтыя стужкі з'яўляюцца сапраўдным «золатам» айчыннай кінастудыі. Што тычыцца «залатога фонду», вядзецца грунтоўная работа над алічбоўкай і рэстаўрацыяй кінаплёнак са старымі фільмамі. Ёсць карціны, якія даўно не дэманстраваліся на вялікім экране. Кінастудыя вырашыла даць ім другое жыццё. Гэта дапаможа ўзбагаціць фонд беларускага кіно — узнавіць яго, захаваць і ў добрай якасці данесці да гледачоў.

Кацярына МАЛЕЙ

на развітанне

Выпраменьваючы дабрыню…

На 99-м годзе пайшла з жыцця Алена Васілевіч. Яна прайшла доўгі шлях, напоўнены стваральнай працай. Нарадзілася будучая пісьменніца 22 снежня 1922 года ў вёсцы Ліпнікі Слуцкага раёна. Рана засталася сіратой. Гадавалася ў дзядзькі, а пасля ў стрыечнай сястры. Скончыла сямігодку ў мястэчку Урэчча. Вучылася ў Слуцкім педагагічным вучылішчы, пасля сканчэння двух курсаў яго паехала ў Рагачоў, дзе ў 1941 годзе стала выпускніцай літаратурнага факультэта настаўніцкага інстытута. У часы вайны працавала бібліятэкаркай і пісарам вайсковай часці. У 1944 годзе паступіла на філалагічны факультэт БДУ, які скончыла ў 1946 годзе, і пераехала да мужа ў Курск. Там працавала літкансультантам у мясцовым выдавецтве. Вярнулася ў Мінск у 1950 годзе.

Дваццаць два гады загадвала аддзелам культуры папулярнага і шматтыражнага па тым часе часопіса «Работніца і сялянка». Пасля працавала ў рэдакцыях дзіцячай літаратуры ў выдавецтвах «Мастацкая літаратура» і «Юнацтва». Большасць яе кніг (а выдала яна іх не так і шмат) былі цікавымі, запатрабаванымі маладой чытацкай аўдыторыяй. Асабліва ўпадабаная школьнікамі хрэстаматыйная тэтралогія «Пачакай, затрымайся…» (1966—1972), у якую ўвайшлі аўтабіяграфічныя аповесці «Расці, Ганька», «Доля знойдзе цябе», «Новы свет» і «Пачакай, затрымайся…» — менавіта за гэты выбітны твор Алена Васілевіч атрымала Дзяржаўную прэмію БССР (1976).

У 1977 годзе ёй было нададзена званне заслужанага работніка культуры. Акрамя згаданай тэтралогіі, можна вылучыць і іншыя адметныя кнігі Алены Васілевіч: «Выбраныя творы» ў трох тамах (1983), «Люблю, хвалююся — жыву...» (1986), «Элегія» (1988), «Першая жонка нябожчыка» (2002), «Выбраныя творы» («Беларускі кнігазбор», 2010).

За што палюбілі дзеці гераіню Алены Сямёнаўны? Дзяўчынка з чулай трапяткой душой стала блізкай многім: пісьменніца распавядала пра сябе і свой свет, з кожнай старонкі выпраменьваючы дабрыню, любоў. І жыццё, нават калі ў ім здараліся непрыемнасці, а часам і несправядлівасці, падавалася ўсё ж вартым таго, каб ствараць, рабіць дабро і дапамагаць сябрам. І гэты светапогляд, скіраваны на тое, каб аддаваць святло і саграваць цеплынёй уласнай душы, можна «прачытаць» у позірку пісьменніцы і на яе апошніх здымках: твар яе застаўся ясным, з адбіткам усёдаравальнага спакою і глыбокай унутранай сілы.

Яшчэ да бронзы

Будаўніцтва новай рэспублікі, актыўнае навуковае і культурнае жыццё Беларусі ў пачатку 1920-х гадоў гуртавалася вакол БДУ і Інбелкульта. Зварот да падзей таго часу, першых крокаў ва ўшанаванні памяці класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча дае магчымасць правесці невялікую гістарычную рэканструкцыю, падсвятліць падзеі невядомымі раней фактамі і сюжэтамі.

На савецкіх п'едэсталах

Новая гістарычная эпоха фарміравала новы пантэон герояў. Сюды траплялі найперш грамадска-палітычныя дзеячы, а таксама выбітныя асобы культуры.

Біяграфія Якава Свярдлова (1885—1919), рэвалюцыянера-бальшавіка, у некаторых момантах перасякалася з сям'ёй Багдановічаў у Ніжнім Ноўгарадзе, асабліва са старэйшым сынам — Вадзімам. Заўчасная смерць вядомага ніжагародца, якая заспела яго «на пасту першага чалавека ў першай сацыялістычнай Савецкай рэспубліцы» (У. Ленін), прадвызначыла стварэнне адной з ранніх кананічных біяграфій бальшавіцкай улады. У 1924 годзе горад Екацярынбург, з якім звязана актыўная палітычная дзейнасць палымянага рэвалюцыянера, быў перайменаваны ў Свярдлоўск.

Яшчэ пры жыцці пісьменніка Максіма Горкага (1868—1936), які быў у сяброўскіх і сваяцкіх стасунках з Адамам Багдановічам, у яго гонар быў «перахрышчаны» горад Ніжні Ноўгарад, названы самы вялікі самалёт свайго часу. Наступнае трыумфальнае шэсце з наданнем імені пісьменніка разгарнулася па ўсім Савецкім Саюзе, засведчылася ў вялікай колькасці назваў населеных пунктаў і вуліц, адукацыйных, навуковых і культурна-асветніцкіх устаноў.

У пачатку 1990-х гадоў перайменаванне, ужо не такое маштабнае, набыло зваротны характар. Свярдлоўск зноў стаў Екацярынбургам, горад на сутоку Волгі і Акі — Ніжнім Ноўгарадам, а вуліцы М. Горкага ў Мінску было нададзена імя М. Багдановіча.

Асвечаныя адраджэннем

Язэп Дыла пісаў да Адама Багдановіча ў лісце ад 5 верасня 1924 года: «Даю сабе і Вам клятву, што настаю, каб будучым летам перавезці прах Максіма на бацькаўшчыну ў Мінск. Пахаваем мы яго побач з Алесем Бурбісам і Сцяпанам Булатам, з арлом і арлянём беларускага адраджэння, яго, Максіма, нашу светлую "зязюлю" адраджэння…»

Ні клятвам, ні планам не суджана было спраўдзіцца. Алесю Бурбісу быў прысвечаны шэраг некралогаў і артыкулаў, а вось імя Сцяпана Булата паспела трапіць у беларускую літаратуру. Памяці выбітнага грамадскага дзеяча прысвяцілі вершы Янка Купала, Міхась Чарот, Змітрок Бядуля. Паэтыку сну, апрабаваную ў нашаніўскі перыяд творчасці ў неарамантычным і мадэрнісцкім духу, аўтар «Раскіданага гнязда» адаптаваў да новых ідэйна-эстэтычных запатрабаванняў:

На магілцы-валатоўцы
Зарунеюць кветак руні;
Зайдзе сонца, ўзыдзе сонца…
— Сні, таварыш, аб Камуне!

(«На смерць Сцяпана Булата»)

Памяць і пошук

У Мінску ўшанаванне памяці Максіма Багдановіча асабліва ўрачыста праходзіла ў 1922—1923 гадах. Актуалізаваць падзеі мінулага часу нам дапамог артыкул гісторыка Андрэя Максімчыка «Малавядомыя старонкі біяграфіі і дзейнасці прафесара С. З. Кацэнбогена (1889—1946)», змешчаны ў часопісе «Социология» (2017, № 2). Асаблівую ўвагу выклікала наступная інфармацыя: «…на публічным пасяджэнні БДУ, прысвечаным пяцігоддзю з дня смерці М. Багдановіча, выступіў з дакладам аб

З архіва Адама Багдановіча.

Максім Багдановіч. Яраслаўль, 1915 г.

творчасці паэта і яго значэнні для беларускай літаратуры». Была ўказана і спасылка на крыніцу: артыкул «Па Менску» з газеты «Савецкая Беларусь» ад 25 лістапада 1922 года… І радасна і трохі прыкра ад таго, што імя Саламона Кацэнбогена, аднаго з айцоў-заснавальнікаў універсітэта, не трапіла ў энцыклапедыю «Максім Багдановіч» (2011).

У імкненні выправіць сітуацыю звяртаемся да пажоўклых старонак указанага выдання Усебеларускага выканаўчага камітэта саветаў. Акунаемся ў стыхію таго часу, калі паэты называліся песнярамі, прозвішчы пісаліся варыянтна — Кацэнбоге(і)н, Пя(ія/іа)туховіч, выпрацоўваліся нормы правапісу, буяў энтузіязм нацыянальнага будаўніцтва, а «паэт чыстай красы» бачыўся праз смугу легендарызацыі. Нават у яго імені па бацьку паслядоўна рабілася памылка — не Адамавічам, а Аляксандравічам велічалі аўтара «Вянка» ў вядучым перыядычным выданні.

Газета «Савецкая Беларусь» ад 25 лістапада 1922 года ў рубрыцы «Па Менску» пісала пра «ўрачыстае пасяджэнне ў Беларускім Дзяржаўным Універсітэце, ахвяраванае памяці беларускага песняра Максіма Багдановіча». (Звернем увагу: мерапрыемства мела прывязку да дня нараджэння, а не смерці.) Пры гэтым не канстатавала падзею, а толькі рэкламавала яе, папярэдне знаёміла з праграмай.

Гартаем далей падшыўку «Савецкай Беларусі». У нумары ад 26 лістапада 1922 года знаходзім допіс пад назвай «Урачыстае пасяджэнне памяці М. Багдановіча» і наступнай інфармацыяй: «З прычыны трохдзённіка па барацьбе з сухотамі ўрачыстае пасяджэнне ў Беларускім Дзяржаўным Універсітэце, пасвячонае памяці беларускага паэта М. Багдановіча, з 26 лістапада пераносіцца на 3 снежня на 5 гадзіну ўвечары».

Урэшце мерапрыемства адбылося. Пра гэта «Савецкая Беларусь» ад 6 снежня 1922 года паведамляла ў змястоўным артыкуле «Вечар памяці беларускага песняра Максіма Багдановіча» (аўтар І. Івашын). Змяніўся склад выступоўцаў, Саламона Кацэнбогена, як гэта было заяўлена раней, сярод іх не было: «У афіцыйнай часціне вечару прынялі ўдзел: рэктар Універсітэту У. І. Пічэта, лектар М. М. Піатуховіч, старшыня Цэнтрабелсаюзу Я. Л. Дыла, беларускі драматург У. Галубок».

Уладзімір Пічэта, гісторык-славіст, першы рэктар БДУ, быў асабіста знаёмы з Максімам Багдановічам. Першая і адзіная іх сустрэча адбылася ў Маскве ў снежні 1915 года. Вядомы дакладны адрас снежаньскага візіту 1915 года студэнта Дзямідаўскага юрыдычнага ліцэя ў Яраслаўлі да прыват-дацэнта Маскоўскага ўніверсітэта: Астожанка, дом 3, кватэра 6. Паэт прасіў вядомага вучонага паспрыяць у напісанні гісторыі Беларусі, дапамагчы ў справе інфармаванасці сталічнай грамадскасці пра беларускі нацыянальны рух. Пазней пра гэтую сустрэчу У. Пічэта неаднаразова згадваў у сваіх выступленнях і артыкулах.

Асобныя тэзісы Язэпа Дылы і сёння не могуць не прыпыніць увагу даследчыкаў:

«У сваім дакладзе т. Дыла выкладае мала каму вядомыя і вельмі цікавыя звесткі аб творах М. Багдановіча. Ён паведамляе, што большая частка твораў песняра зусім невядома беларускаму грамадзянству, бо дагэтуль не надрукавана»;

«М. Багдановіч надта ўдзячна пераклаў на беларускую мову фінскую народную паэмы "Калевала", але дзе знаходзіцца гэты пераклад — невядома»;

«Дакладчыку вядомы надзвычайна ўдалыя апрацоўкі твораў М. Багдановіча беларускім кампазытарам К. Галкоўскім, які знаходзіцца ў Вільні».

Даклад Міхаіла Піятуховіча быў пабудаваны на тыпалогіі з творчасцю еўрапейскіх майстроў пяра і мастацкай практыкай імпрэсіяністаў.

Пасля гартання нумароў «Савецкай Беларусі» ўспомніўся дакумент, выяўлены намі раней у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, які нечакана цікавым праменьчыкам падсвечвае мінулы час. На першы погляд, гэта звычайная канцылярская папера. Але ж гэта 1926 год.

На аркушы з вуглавым штампам на чатырох афіцыйных мовах у БССР (беларускай, рускай, яўрэйскай, польскай) змешчана паведамленне Праўлення БДУ ад 7 верасня 1926 года за № 80, што 15—20 верасня склікаецца «Усебеларуская Прыродазнаўчая канферэнцыя, на якую

Адам Багдановіч з супрацоўніцамі часопіса «Полымя». Мінск, 1923 г.

запрашаюцца выкладчыкі прыродазнаўчых навук Рабфакаў, Тэхнікумаў, праф. школ і поўных сямёхгодак». Асабліва звярнула на сябе ўвагу і, як сёння кажуць — усміхнула, прыпіска: «Канферэнцыя працягнецца 5 дзён. Дэлегаты павінны ўзяць з сабой падушку і пасцельныя прылады».

Калі архівы мералі пудамі

Поспехі нацыянальнага будаўніцтва ў пачатку 1920-х рэгулярна асвятляліся на старонках агульнасаюзнай прэсы. Так, літаратурна-мастацкі часопіс «Красная нива» ў № 12 ад 25 сакавіка 1923 года змясціў артыкул Хрысанфа Херсонскага «Інстытут беларускай культуры», у якім былі прадстаўлены дасягненні і планы названай навуковай установы. Сярод іншага паведамлялася: «Інбелкультам падрыхтаваны для акадэмічнага выдання сачыненні памерлых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, якія выйдуць упершыню ў свет у поўным зборы. У першую чаргу будуць выдадзены творы Дуніна-Марцінкевіча, Багдановіча, Цёткі, Каганца і Ядвігіна Ш.» Пад тэкстам быў змешчаны візуальны рад: партрэты Янкі Купалы, Якуба Коласа і Змітрака Бядулі.

Маскоўская публікацыя трапіла на вочы Адаму Багдановічу. Узрушаны загадчык навуковай бібліятэкі пры Яраслаўскім гістарычным музеі напісаў аб'ёмісты ліст на адрас Інстытута беларускай культуры. Асноўная сутнасць звароту бацькі «песняра чыстай красы» была выкладзена ў наступных радках: «…у мяне захоўваецца яго архіў і ўсё тое, што мела адносіны да яго асобы і да яго літаратурнай дзейнасці: некалькі дзясяткаў яго вершаў апошняга перыяду, якія нідзе не друкаваліся, чарнавікі амаль усіх яго вершаў і іншых пісанняў, экзэмпляр асобнага выдання яго вершаў ("Вянок") з яго заўвагамі і праўкамі, адбіткамі яго артыкулаў на рускай мове, яго перапіска і перадсмяротныя лісты да мяне і да таварышаў, яго фатаграфічныя карткі, у тым ліку адна з пазнейшых, беларуская азбука, над якой ён працаваў у апошнія дні свайго жыцця і т. п. Па вазе ўсё ўяўляе значную масу — каля пуда».

Куфэрак з каштоўным начыннем збярогся ў час белагвардзейскага мяцежу, пажараў у Яраслаўлі 1918 года. (У сталіцы Беларусі меркавалі, што сям'я паэта не ўцалела ў час гэтай узброенай завірухі.) Адам Багдановіч выказаў гатоўнасць перадаць на радзіму ўнікальны сямейны збор, настойваў на сваім асабістым прыездзе з гэтай мэтай у Мінск.

Рызыкнём выказаць катэгарычнае меркаванне: нечаканае аб'яўленне бацькі паэта, перадача ім вялікага архіва прымусіла Інбелкульт не толькі мяняць свае выдавецкія планы, але і карэкціраваць стыль крыніцазнаўчай, навукова-даследчай дзейнасці. Замест аб'яўленага трыумфальнага кніжнага шэсця ў духу «*Exegi monumentum*» новай эпохі пачалася няспешная, скрупулёзная тэксталагічная праца, стварэнне факталагічна напоўненага жыццяпісу, фіксацыя ўспамінаў людзей з блізкага кола знаёмых аўтара «Вянка» і інш. Таму двухтомнае выданне «Творы М. Багдановіча» (планаваўся яшчэ і трэці том) пабачыла свет аж у 1927—1928 гадах. З заяўленай кагорты пісьменнікаў-класікаў у акадэмічным фармаце была выдадзена ў 1934 годзе толькі творчая спадчына Цёткі (Алаізы Пашкевіч). А ў 1935-м незапланавана дадаўся Паўлюк Трус, заўчасна спачылы пясняр будаўніцтва новай рэспублікі.

Мінскі трыумф

Пасля непрацяглай перапіскі, узгаднення ўсіх абставін перадачы архіва Адам Багдановіч прыязджае ў Мінск. У лісце ад 18 чэрвеня 1923 года ён апісвае свайму сыну Паўлу ўчарысты прыём, арганізаваны ў яго гонар у БДУ: «Мне наладжвалі такія авацыі, што, здавалася, не будзе ім канца. І калі патрэбна было выступаць, то я доўга не мог знайсці голаса: дыханне перахапіла. Яго партрэт быў выстаўлены на эстрадзе. Напісана спецыяльная кантата ў яго гонар, цудоўная і па змесце, і па музыцы. Даклады і прамовы. <…> Агульная выснова ўсіх выступленняў, што Максім — краса і гонар беларускай літаратуры, які пераўзыходзіць сваім значэннем усіх іншых паэтаў».

На ўрачыстасці было прынята рашэнне аб усталяванні памятнай дошкі ў гонар аўтара «Вянка»: «На жаль, пад канец вечар давялося згамтаць: электрычнасць згасла і падпіска на памятную мармуровую дошку на доме, дзе ён нарадзіўся, праводзілася пры лямпах».

Дакумент пад назвай «Падпіска на мармуровую дошку, дзеля азначання дому на Камунальнай вуліцы, дзе радзіўся Максім Багдановіч» сёння захоўваецца ў архіўных зборах Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Паводле яго, першымі ўнеслі свае сторублёўкі Аркадзь Смоліч, Адам Багдановіч, Язэп Лёсік, Язэп Дыла і Якуб Колас.

Да бронзавых помнікаў тады яшчэ было далёка, а вось мармуровая памятка заняла сваё годнае месца.

Мікола ТРУС,
кандыдат філалагічных навук
Здымкі з фондаў Літаратурнага музея М. Багдановіча

Калі б камяні гаварылі...

Тое, што не гарыць у агні

Праектныя работы па рэстаўрацыі Крэўскага замка распачаліся ў 2013—2014 гадах. Кансервацыю Княжацкай вежы ажыццявілі ў 2017 годзе, паўночна-заходняй сцяны — у 2018-м, паўночна-ўсходняй — у 2020-м. Усе работы праводзіліся за сродкі фонду Прэзідэнта па падтрымцы культуры і мастацтва і рэспубліканскага бюджэту.

Што да планаў на найбліжэйшы год, то разлічваюць на рэстаўрацыю паўднёва-заходняй сцяны з абавязковым захаваннем фрагментаў аўтэнтычнай абліцоўкі XIV стагоддзя, каб дэманстраваць у камені балцкую кладку. Ёсць спадзевы і на аднаўленне паўднёва-ўсходняй сцяны, якая найбольш пацярпела падчас Першай сусветнай вайны: з аднаго боку ад яе знаходзіліся расійскія імператарскія войскі. Адтуль у асноўным і ажыццяўляўся абстрэл.

Па паўднёва-ўсходняй сцяне нядаўна праводзіліся работы: археалагічныя пошукі, даследаванні падмуркаў. Гэта патрэбна для далейшай рэстаўрацыі. Перадпраектныя прапрацоўкі ідуць сёлета і па рэстаўрацыі Княжацкай вежы.

— І хоць работы зоймуць шмат часу, ёсць ужо задума складаць канцэпцыю экспазіцыі — гэта будзе працай некалькіх наступных гадоў, — дзялілася планамі дырэктар Смаргонскага гісторыка-краязнаўчага музея Алена Бобіна.

Што прывабіць айчынных і замежных турыстаў, чым зацікавіць школьнікаў у вывучэнні гісторыі краіны, — гэтыя пытанні на парадку дня супрацоўнікаў дзяржаўнай установы — нядаўна ў яе межах утварыўся сектар гісторыі Крэўскага замка. Кожныя выхадныя музейшчыкі працуюць не толькі ў сценах смаргонскай скарбніцы мінуўшчыны, але і выязджаюць у Крэва, распавядаюць наведвальнікам славутую гісторыю гэтых мясцін.

У 2018 годзе паводле класіфікацыі архітэктурных помнікаў Крэўскі замак атрымаў статус помніка міжнароднага значэння — І катэгорыю. Алена Бобіна, якая часта працуе на тэрыторыі замка, ганарыцца тым, што мае непасрэднае дачыненне да згаданай падзеі:

— У Міжнароднай паслядыпломнай летняй школе «Нясвіжская акадэмія», дзе я вучылася, у нас была тэма «Ахова і рэстаўрацыя помнікаў абарончага дойлідства». Тэмай маёй дыпломнай работы, абароненай у Варшаве ў 2019 годзе, стала «Ідэнтыфікацыя і валарызацыя Крэўскага замка». Пасля на падставе сваёй работы я і напісала абгрунтаванне, якое накіравалі ў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Да таго часу Крэўскі замак меў II катэгорыю, лічыўся помнікам нацыянальнага значэння. Разлічваем, што ў хуткім часе помнік архітэктуры трапіць і ў спіс ЮНЕСКА.

Выпускніца юрыдычнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Алена Бобіна пачынала свой шлях як спецыяліст па ахове культурнай спадчыны. За сем гадоў працы павялічыла спіс помнікаў на тэрыторыі раёна: з 28 гісторыка-культурных каштоўнасцей і 38 аб'ектаў у іх складзе да 36 гісторыка-культурных каштоўнасцей і 60 аб'ектаў у іх складзе.

— Я насамрэч шчаслівая тым, што спрычынілася да развіцця Крэва як турыстычнага аб'екта. Мне радасна, што некаторыя людзі прапаноўваюць сваю дапамогу па Крэўскім замку, пытаюцца: «Што мы можам зрабіць?» Не забываюць і пра спонсарскую дапамогу. Часам і сама звяртаюся да кіраўнікоў прадпрыемстваў. Зазвычай не адмаўляюць.

…Моладзь, сямейныя пары з дзецьмі, людзі сталага веку… Хто фатаграфуецца на фоне сцяны з буслом, хто аглядае мясцовасць, іншыя пастаянна збіраюцца ў экскурсійныя групы і ходзяць за гідам, нехта вучыцца кідаць у мішэнь баявыя сякеры ці страляць з лука, ёсць і пакупнікі каля прылаўкаў з памятнымі сувенірамі — звычайны дзень з жыцця замка, адзін з ланцужка падобных…

Экскурсанты перамяшчаюцца паміж пунктамі паказу — такіх на тэрыторыі замка некалькі. Пакуль не засыпалі да пачатку новага сезона месцы раскопаў, на вялікую глыбіню — каля 4 метраў — адкрыты падмуркі.

Падмуркі часам і большай глыбіні ставіліся на так званыя *падушкі* з дубовых і яловых жэрдак. У раскопах можна бачыць некранутую ні дажджом, ні снегам, ні баявымі падзеямі, ні часам муроўку. «Зямля — найлепшы кансерватар», — жартуюць археолагі. Захавала муроўка і сляды агромністага пажару ў 1433 годзе, калі прэтэндэнт на вышэйшую ўладу, Свідрыгайла, два дні трымаў замак у аблозе, а потым спаліў усё драўлянае, што тут было: галерэі, пабудовы…

Так званыя каменныя *шчокі*, што апаясваюць замак па вонкавым баку — бітая цэгла — служылі дрэнажом (у тыя часы практыкавалася безадходная вытворчасць, калі ўсё выкарыстоўвалася). Таўшчынёй да 70 сантыметраў, шчокі выконвалі і дэкаратыўную функцыю, але галоўнай функцыяй, як можна меркаваць, была амартызацыйная — змякчаць удары каменных ядраў, каб муры заставаліся цэлымі.

Менавіта турысты зазвычай першымі знаёмяцца з інфармацыяй па выніках раскопак — экскурсавод распавядае, што было цікавага з апошніх знаходак, робіць пэўныя высновы. Пройдзе час, пакуль свежыя звесткі трапяць на палосы газет і часопісаў альбо стануць

Месца раскопу.

здабыткам навуковай супольнасці… Як правіла, экскурсія доўжыцца каля 40 хвілін — улічваючы адсутнасць экспазіцыі, гэта вельмі падрабязнае, змястоўнае азнаямленне з гісторыяй, асаблівасцямі архітэктуры і рэканструкцыі.

Дарэчы, у планах Смаргонскага музея на снежань бягучага года — правесці семінар, каб вядомыя гісторыкі, калекцыянеры і даследчыкі падзяліліся меркаваннямі, якім яны бачаць развіццё гэтага гістарычнага аб'екта, што цікавае, на іх думку, тут можна зрабіць для турыстаў. Ёсць ідэя і арганізаваць выстаўку па выніках сезона раскопак.

Муры і падмуркі гісторыі

Сур'ёзныя археалагічныя даследаванні ў Крэве, як распавядаў кіраўнік раскопак Алег Дзярновіч, пачаліся з 1985 года — гэта была сумесная экспедыцыя Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта і Белрэстаўрацыі. Але сістэматычныя работы пачаліся з 1988 года. Кіраваў імі Ігар Чарняўскі. Яны былі неабходныя дзеля праекта па кансервацыі і рэстаўрацыі Крэўскага замка.

— Тады ж, у 1980-х, яшчэ студэнтам браў у тых даследаваннях удзел, — згадаў А. Дзярновіч. — Цяпер бяру ўдзел у сваёй экспедыцыі ад Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі. Мы супрацоўнічаем з фондам «Крэўскі замак» і Белрэстаўрацыяй — займаемся замкам з 2012 года.

Археалагічныя даследаванні патрэбны для таго, каб правільна зрабіць кансервацыю. Магчымасць гэтая з'явілася ў апошнія чатыры гады, калі ёсць стабільнае фінансаванне. Даследаванні ажыццяўляюцца альбо ў форме раскопак, альбо шурфоўкі. Земляныя работы з удзелам археолагаў з 2018 года адбываюцца штогод.

— Даследаванні маюць прыкладны характар, — знаёміў з асаблівасцямі сваёй працы археолаг. — Нашы знаходкі — гэта найперш падмуркі. Мы капаем шурфы ў вызначаных архітэктарамі і канструктарамі Белрэстаўрацыі месцах, каб паглядзець, у якім стане знаходзяцца падмуркі, вызначыць глыбіню іх залягання і канструкцыйна-тэхнічныя асаблівасці. Гэтую інфармацыю мы здабываем з выкарыстаннем археалагічнай методыкі, з пераборкай грунту. Здараюцца знаходкі, якія сведчаць пра матэрыяльную культуру той ці іншай эпохі.

Крэўскі замак — гэта яшчэ і месца памяці Першай сусветнай вайны. Частка археалагічных знаходак датуецца менавіта тым перыядам.

— Сцяна, якую мы даследуем сёлета, — паўднёва-ўсходняя, якраз і была найбольш разбурана артылерыяй у ліпені 1917 года, калі быў наступ на нямецкія пазіцыі, што месціліся ў замку, — удакладніў А. Дзярновіч. — Уздоўж гэтай сцяны былі бліндажы. Так, сёлета мы «селі» (як кажуць археолагі) на сметніцу Першай сусветнай — было цікава даведацца, як нямецкае камандаванне бавіла час з 1915 да пачатку 1918 года. Знайшлі пляшкі з-пад віна і піва пачатку XX стагоддзя, фаянсавыя файкі — гэта зрэз побыту таго часу...

Поўнай нечаканасцю, па словах Алега Дзярновіча, стала тое, што каля сцяны, уздоўж якой знаходзіліся нямецкія бліндажы і былі моцныя абстрэлы і дзе вельмі перакапаны пласт, удалося выявіць багата матэрыялаў XIV—XV стагоддзяў:

— Калі мы капаем Княжацкую вежу, галоўны данжон, то зразумела, што там знаходзяцца і фрагменты фрэсак, і арбалетныя балты. Але і тут мы знайшлі даволі шмат фрагментаў гаршковай кафлі канца XIV — пачатку XVI стагоддзя ды іншы керамічны матэрыял. І знаходкі гэтыя важныя, таму што карэкціруюць нашы ўяўленні пра планаграфію дзядзінца Крэўскага замка. На пагорку, мысе, бліжэй да данжона, былі знойдзены і казармы, спаленыя яшчэ Свідрыгайлам падчас штурму ў 1433 годзе. Меркавалася, што тут быў стаў, сажалка, бо ў замку ёсць сістэма гідрарэгуляцыі — нішы і арачныя праёмы. Мы прыйшлі да высновы, што вада была ў замку і рэгулявалася аркамі. Але не была цалкам затоплена яго паўднёва-ўсходняя частка, як лічылася раней, — там знаходзіліся жылыя пабудовы, аб чым і сведчаць знаходкі гаршчковай кафлі.

Расказаў Алег Дзярновіч і пра яшчэ адзін тып цікавых знаходак, што дапамагае зразумець канструкцыю замка з боку дзядзінца. Там было знойдзена багата фрагментаў гатычнай паўцыркульнай дахоўкі з шыпамі. Гэта істотныя артэфакты, таму што адносна рэканструкцыі частак замка вядзецца дыскусія, у якой ключавы момант — зразумець, як выглядала баявая галерэя: выступала са знешняга боку сцяны ці мела асноўны аб'ём з унутранага боку, з боку дзядзінца. Вынікі археалагічных пошукаў, па словах кіраўніка, — гэта шматлікія фрагменты даховак з унутранага боку і амаль поўная іх адсутнасць са знешняга боку — сведчанне на карысць той версіі, што галерэя мела асноўны аб'ём з боку дзядзінца…

Час і мары

…Жыццё замка не стаіць на месцы, адбываюцца ў яго сценах пэўныя падзеі, з'яўляюцца новыя і новыя наведвальнікі, у душах якіх запальваюцца цяпельцы гонару за слаўнае гістарычнае мінулае Айчыны і любові да яе. Нядаўна прайшоў штогадовы фестываль «Кераміка Крэва», у межах якога адбылася фотавыстаўка «Рэстаўрацыя Крэўскага замка». Прадстаўленыя ў часовай экспазіцыі здымкі добра ілюстравалі розніцу паміж тым, што было да рэстаўрацыі і тым, што стала. Акрамя таго, падчас мерапрыемства працаваў «Горад майстроў»: умельцы ў галіне керамікі і іншай народнай творчасці дэманстравалі свае вырабы. На дзіцячай пляцоўцы «Кола сяброў» аніматары забаўлялі дзяцей, пад кіраўніцтвам каваля можна было прайсці майстар-клас і выкаваць манетку, а пад наглядам рамесніка-рэканструктара — паўдзельнічаць

Рэканструктар Кастусь Дземідовіч праводзіць экскурсію.

у сярэднявечных гульнях. Апантаны майстар сваёй справы, Кастусь Дземідовіч сам вырабляе вайсковыя строі мінулых стагоддзяў па ўзорах тых часоў. Былі сярод прадстаўленых ім да ўвагі экскурсантаў і рэканструяваныя ім рэчы ваеннай гісторыі — зброя, адноўленыя каскі, спражкі, прадметы побыту. «Мару, каб Крэўскі замак стаў жамчужынай у кароне беларускай спадчыны!» — зазначыў ён падчас гутаркі.

Яна БУДОВІЧ, фота аўтара

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

Запрашэнне адпачыць

У выдавецтве «Чатыры чвэрці» выйшла новая кніга пісьменніка Паўла Гушынца «Пара ў водпуск». Гэта зборнік апавяданняў, сюжэты для якіх аўтар назапашваў на працягу жыцця і адлюстроўвае зараз у сваіх кнігах.

«Паважаныя чытачы, лета на носе. Нават калі вы ўзялі гэту кнігу ў рукі ў пачатку верасня, то ўсё роўна лета на носе. Бо лета — не пара года, а стан душы. Пакіньце на час свае справы і клопаты, наліце чай, каву, кактэйль. І чытайце. Пара ў адпачынак...» — раіць Павел Гушынец. Ну што ж, як наказаў аўтар, наліваю кубак кавы і разгортваю кнігу. Толькі адпычынак ужо прайшоў. Але, нягледзячы на гэта, кніга навявае цеплыню, і гэтай цеплынёй хочацца падзяліцца. Магчыма, так уплывае яркая вокладка, а, магчыма, сама атмасфера расповедаў, змешчаных у выданні.

Пачынаецца кніга нізкай апавяданняў з дзяцінства аўтара, юнацтва, студэнцтва. Складаецца з трох частак: «Некалькі простых гісторый», «Я ж усё-такі трохі доктар», «Пара ў водпуск». Аўтар не вельмі плаўна перамяшчае чытача з аднаго часавага прамежку ў іншы. Прыходзіцца звяртацца да біяграфіі П. Гушынца, каб зразумець, чаму апавяданні пра вучобу ў медуніверстэце чаргуецца з расказам пра «гопніцкае» юнацтва. Вікіпедыя паведамляе, што аўтар скончыў Полацкае медыцынскае вучылішча, затым — Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт. Падчас вучобы П. Гушынец працаваў санітарам, афіцыянтам у начным рэстаране, рознарабочым на будоўлі, супрацоўнікам і кіраўніком у розных фармацэўтычных кампаніях.

Так становіцца зразумела, што творы, якія ў тым ліку складаюць кнігу «Пара ў водпуск», адлюстроўваюць асноўныя этапы жыцця аўтара. Ранейшыя кнігі П. Гушынца чытачы крытыкавалі за незразумелы парадак апавяданняў у рамках адной кнігі. Выданне «Пара ў водпуск» сведчыць пра тое, што аўтар намагаўся выправіцца і быццам расфасафаў свае гісторыі па тэматычных блоках. Тым не менш і тут сустракаюцца апавяданні, якія збіваюць лагічны парадак аповеду.

Творы П. Гушынца дэманструюць яго цудоўную назіральнасць і ўключанасць. Ёсць такі тып людзей, у якіх на любую тэму знойдзецца гісторыя. Здаецца, што Павел Гушынец — менавіта з гэткіх. З ім утульна і цікава. Сваёй, амаль размоўнай манерай апавядання ён лёгка знаходзіць з чытачом агульную мову, выклікае да сябе прыхільнасць. Мова аўтара такая ж простая, лёгкая і лаканічная. Ёсць цікавая тэорыя пра тое, што ў тэкстах, напісаных пісьменнікамі-мужчынамі, выкарыстоўваецца больш дзеясловаў, што надае ім дынамічнасць. Творы П. Гушынца пацвярджаюць гэтую тэорыю. Сюжэты апавяданняў — у дзеяннях. З аднаго боку, гэта робіць тэксты хутка чытэльнымі, лёгкімі для ўспрымання, а з іншага — крыху не хапае разважлівасці.

Нягледзечы на тое, што большасць апавяданняў з кнігі гумарыстычныя, часам сатырычныя, сустракаюцца і творы, якія натхняюць на глыбокія думкі. Да ліку такіх належыць апавяданне «Сінія кветкі». Сюжэт твора не новы. Памёр бацька, дачка не паспела на пахаванне і перажывае, што прыязджала рэдка; бясконцы роздум аб тым, ці правільна яна жыве, і ўспаміны... Аднак сімвалам шчаслівага дзяцінства і часу, калі сям'я была поўнай, з'яўляюцца сінія кветкі на сцяне дома. Бацька разам з дачкой намалявалі іх даўно. Кацька вярнулася на парог роднага дома і ўбачыла свежы малюнак, які паспеў аднавіць бацька. Чаму кветкі менавіта сіняга колеру? У часы Старажытнага Усходу сіні колер сімвалізаваў вясну, росквіт, адраджэнне. Магчыма, аўтар такім чынам пакінуў чытачу надзею на працяг жыцця ў гэтым доме…

Не менш філасофскай і сімвалічнай гісторыяй з'яўляецца «Пра любоў да бабуль», а дакладней, пра нелюбоў. Як піша аўтар: «Гісторыя нетыповая, няхай даруюць мне пастаянныя чытачы, але да маёй нелюбові да жанчын сталага веку гадзіну таму дадаўся яшчэ адзін пункт». Выснова, якую можна зрабіць, сведчыць аб тым, што нельга асобна ўзятае здарэнне прыраўноўваць да агульнай нелюбові... Напрыканцы апавядання аўтар сатырычна дадае: «Старасць трэба паважаць. З узростам людзі становяцца мудрэйшымі». Але сюжэт твора быццам бы даказвае адваротнае. Хочацца, каб чытач сам зрабіў выснову, нягледзячы на ацэначнасць пісьменніка, якой у апавяданнях нямала: «так сабе фантазія ў карэспандэнта», «страшненькі, як смерць, затое мускулісты», «чарнаскурая маршчыністая старушэнцыя» і г. д.

Дайшоўшы нарэшце да той часткі, якую чакаеш убачыць напачатку, атрымліваеш дозу пазітыву. Тут аўтар сабраў свае замалёўкі — так званыя запіскі вандроўніка, у якіх акунае чытача, як і абяцаў, у атмасферу бесклапотнасці, размеранасці, спакою і адпачынку. Можна разам з П. Гушынцом адправіцца на Кубу, у Еўропу, Турцыю ці Егіпет, Маскву… Тое, што яго ўразіла ці проста не пакінула абыякавым, лягло на старонкі кнігі. Цікава паназіраць, на чым канцэнтруе ўвагу П. Гушынец падчас сваіх падарожжаў. Часта ўзнікае ўражанне, што ён, як тыповы турыст, засяроджваецца толькі на негатыўных момантах.

Але ў цэлым кніга Паўла Гушынца атрымалася пазітыўная. Апавяданні лёгкія, гумарыстычныя, менавіта за такія чытачы палюбілі пісьменніка. Некаторыя творы яркія і запамінальныя, некаторыя выклікаюць пытанні. Але з імі варта пазнаёміцца і скласці сваё меркаванне. Так што налівайце кубак чаю, кавы ці кактэйль і адпраўляйцеся ў адпачынак разам з аўтарам.

Дзіяна КАЗІМІРЧЫК

Хто дапаможа са зламаным роварам?

Кожны раз, беручы ў рукі зборнік твораў, якія ў анатацыі абазначаюцца як сатырычныя і гумарыстычныя, рызыкуеш аказацца ў відавочным палоне сваіх інтарэсаў, пераваг, звычак і не ацаніць вартасць спроб таго ці іншага аўтара, памыліцца ў вытлумачэнні літаратурнага тэксту. Да таго ж гумар — настолькі гнуткая і залежная ад многіх акалічнасцей з'ява, што рабіць стапрацэнтныя высновы, а тым больш прычэпліваць ярлыкі, напрыклад, «новы», «сучасны» ці «местачковы», падаецца занадта пагардлівым і прадузятым.

Адно дакладна: колькі б гумарысты ні казалі, што іх літаратурныя творы ці выступленні не скіраваны на тое, каб каго-небудзь пакрыўдзіць і паказаць з непрыгляднага боку, пакрыўджаныя ўсё адно знойдуцца. А калі іх няма, ці не нагода задумацца, чаму? Усё настолькі бяскрыўдна і «прычасана» ці тэксты мала хто чытае і слухае? Гумарыст Міхась Сліва, аўтар шматлікіх кніг прозы, ужо не адно дзесяцігоддзе плённа працуе ў гэтым кірунку. Многія творы аўтара часта адзначаліся рознымі літаратурнымі прэміямі. Аматары лічаць яго жарты нязлоснымі і зычлівымі і цэняць за адсутнасць пошласці і непрыстойнасці. Пісьменніку ўдаецца гэта не ў апошнюю чаргу дзякуючы сканцэнтраванасці на зразумелых штодзённых тэмах, напрыклад, стасунках начальніка і супрацоўнікаў, і адсутнасці жартаў пра рэальных асоб, хоць, відавочна, нейкія паралелі знайсці заўсёды можна.

Кожны твор у новым зборніку Міхася Слівы «Кума з Аўстрыі» («Чатыры чвэрці», Мінск, 2021) — гэта адлюстраванне ўзаемаадносін у пэўнай іерархіі ці супольцы. Тут можна скласці даволі ўстойлівы ланцужок, зразумела, з выключэннямі, у якім элементы могуць мяняцца ў залежнасці ад абставін: жонка і муж, сябар і сяброўка, начальнік і падначалены. Яскравы прыклад сімбіёзу ўсіх складнікаў — творы, прысвечаныя кумаўству. Сярод іх — «Скарачэнне штатаў», дзе дырэктар не можа вызначыцца, каго звольніць, бо адзін — яго стрыечны брат, другая — сястра жонкі… Спіс можна працягваць.

Найбольшую цікавасць выклікаюць невялічкія па памеры сатырычныя назіранні, дзе аўтару нешматлікімі сродкамі ўдаецца паказаць чытачам знаёмую, як правіла, карціну. Робіць пісьменнік гэта немудрагелі-ста, як, напрыклад, у тэксце «Тонкі разлік»: «У двары стаяла альтанка, якую трэба было тэрмінова знесці. Старшыня жыллёвага кааператыву некалькі разоў прасіў жыльцоў разабраць яе, але ніхто не хацеў і пальцам паварушыць. Тады старшыня павесіў на альтанцы запіску: "Ахоўваецца дзяржавай!" За адну ноч альтанка была разабрана».



А вось у творы пад назвай «Тост» аўтар некалькімі штрышкамі малюе гіпербалічны вобраз і прапаноўвае маналог героя, які лічыць сябе сціплым чалавекам: «Шаноўны Іван Пятровіч! — звярнуўся ён да Бярозкіна, асцярожна трымаючы ў руках, каб не расплюскаць, з берагамі налітую чарку. — Мне ёсць што сказаць пра цябе ў гэты ўрачысты і хвалюючы дзень. Мы даўно працуем разам. Хаця я прыйшоў значна раней на завод і больш папрацаваў, больш ведаю і ўмею. Ты, паважаны Іван Пятровіч, як і я, не шкадаваў асабістага часу і сіл для выканання заданняў кіраўніцтва. Тут, прама скажам, ты заўсёды браў прыклад з мяне, а я шчодра дзяліўся сваім багатым вопытам. І ніколі не патрабаваў, каб ты пачаставаў мяне ў кафэ або, на крайні выпадак, наліў сто грамаў дзе-небудзь у скверы, па дарозе дадому…»

Так ці інакш, у вочы кідаецца пэўная непраўдападобнасць гісторый, асабліва тых, што тычацца здрады, хлусні і рэўнасці, хоць чаго ні здараецца, калі гаворка ідзе пра такія паняцці… Напрыклад, ці мог муж здрадзіць жонцы толькі таму, што ў іншай жанчыны бялізна прыгажэйшая («Спадабалася бялізна»), альбо не купіць ёй ровар, бо па дарозе ён можа зламацца, а дапамогу прапануе цікавы малады чалавек («Раўнівы муж»)? Адзінае, што адчуваеш пасля прачытання такіх твораў, — шкадаванне, што аўтары замест таго, каб пазбягаць бязглуздых стэрэатыпаў, падтрымліваюць іх, выкарыстоўваючы як аснову для апавядання. Зрэшты, дзякуючы такім спробам можа нараджацца дыскусія, у якой не столькі пісьменнікі, колькі чытачы маюць магчымасць канчаткова вызначыцца з асабістымі поглядамі на тую ці іншую тэму.

Узнагарода ж творцы-гумарыста (дарэчы, не найвышэйшая з магчымых) — смех ці ўсмешка таго, на каго разлічваў. Калі гэтага няма, вырак жалезны і несуцяшальны: увагі і часу чытача дадзеныя спробы не варты. У зборніку «Кума з Аўстрыі» такіх хапае: «Незвычайная Снягурачка», «На прыёме да ўрача», «Каб паланіць чытачоў», «Рабы кахання», «Пачастунак», «Каб толькі ехаць» і некаторыя іншыя могуць быць хіба што адным са складнікаў ці завязкай больш буйнога твора, але не самастойнымі. Тычыцца гэта і апавядання, якое дало назву зборніку і на якое было шмат надзей, што не спраўдзіліся: у цэнтры сюжэта прадказальнае жаданне галоўнай гераіні мець сваякоў за мяжой — толькі таму, што шмат падарункаў будуць прывозіць.

Адсутнасць падтэкстаў — галоўная характарыстыка новай кнігі Міхася Слівы, і з гэтым трэба лічыцца. Але якраз найвышэйшая ўзнагарода майстра-гумарыста — разважанні чалавека праз пэўны час пасля прачытання, вяртанне да пэўных гісторый зноў і зноў, пошукі адказаў, бо прапанаваныя ці не задавальняюць, ці адсутнічаюць. Аўтар гэтых радкоў не здолела знайсці шмат нагод для роздумаў. Будзем спадзявацца, гэта ўдасца больш удумліваму чытачу.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Як зрабіць урок чытання любімым

«Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» зрабіла ўнікальны падарунак педагогам, бібліятэкарам і ўсім, хто зацікаўлены ў развіцці дзіцячага, падлеткавага чытання, — дапаможнік-хрэстаматыю «Сустрэча з пісьменнікам, або Як зрабіць урок чытання любімым».

— Задума стварыць гэтую кнігу падказана самім жыццём, — зазначае складальнік кнігі Ірына Буторына ў кароткай прадмове. — У жывой цікаўнасці дзяцей, імкненні актыўна спасцігаць навакольны свет я пераканалася за 15 гадоў працы настаўнікам, пачатковых класаў. Назіранні выкладчыка методыкі літаратурнага чытання дазволілі адзначыць, што і настаўнікам, і студэнтам — будучым педагогам — складана арганізаваць падрыхтоўчую гутарку перад знаёмствам з новым творам, таму што звесткі пра пісьменнікаў, сабраныя ў энцыклапедычных даведніках мінулых гадоў, даюць толькі агульнае ўяўленне пра жыццёвы і творчы шлях творцы, з'яўляюцца складанымі для ўспрымання вучнямі пачатковых класаў, не маюць прывабнай эмацыянальнай афарбоўкі, што так важна для маленькага чытача!

Чакаюць сустрэчы з Генадзем Аўласенкам, Алесем Бадаком, Раісай Баравіковай, Анатолем Бензеруком, Расціславам Бензеруком, Тамарай Бунтай, Анатолем Бутэвічам, Наталляй Бучынскай, Аленай Васілевіч, Нінай Галіноўскай, Васілём Жуковічам, Анатолем Зэкавым, Алесем Карлюкевічам, Уладзімірам Ліпскім, Уладзімірам Мазго, Міколам Маляўкам, Аленай Масла, Іванам Муравейкам, Міхасём Пазняковым, Аленай Стэльмах, Кацярынай Хадасевіч-Лісавой, Міколам Чарняўскім, Уладзімірам Ягоўдзікам, Надзеяй Ясмінскай. Пісьменнікі імкнуцца распавесці тое, як складвалася іх жыццёвая біяграфія з прыцэлам на развіццё творчых, літаратурных памкненняў, расказваюць пра людзей і з'явы, якія вывелі іх у свет мастацкага слова.

— Па вялікім рахунку, настаўнік кожнага пісьменніка — жыццё, — распавёў Іван Муравейка. — І тут важна самому да ўсяго дайсці, самому адчуць тое, пра што пішаш, самому гэта перажыць. А вось творчаму майстэрству вучыцца варта. Мне вельмі пашанцавала, што ў Тальскай сямігодцы беларускую мову і літаратуру выкладаў Мікола Лобан, будучы вучоны-моваznаўца і пісьменнік-раманіст. Тады яшчэ ніхто не называў яго пісьменнікам, але адразу адчувалася: штосьці закладзена ў яго душы. Ён звярнуў на мяне ўвагу, даваў чытаць кніжкі, дапамагаў парадамі.

— Кнігі я чытаю запоем з самага дзяцінства, — дзеліцца Уладзімір Ліпскі. — У мяне захавалася ў архіве некалькі сшыткаў, у якія яшчэ школьнікам навыпісваў шмат мудрых цытат з прачытаных кніг. Мне было цікава чытаць пра гісторыю Беларусі.

— Чаму я вырашыў стаць пісьменнікам і ці складаная гэта праца? — задаўся пытаннем Анатоль Зэкаў. — Ды нічога я не вырашаў! Проста чытаў кнігі, зайдросціў тым, хто іх так цікава і «складна» пісаў. Тым больш што ў мяне перад вачыма былі і свае прыклады. Пісалі мае старэйшыя аднавяскоўцы: паэзію — Уладзімір Дзюба, прозу — Таццяна Гарэлікава (пазней абое сталі прафесійнымі пісьменнікамі). І вучыла нас адна настаўніца беларускай мовы і літаратуры Ульяна Фёдараўна Лазавенка. «Значыць, пісьменнікі нараджаюцца не толькі недзе далёка, — думаў я. — Могуць яны, аказваецца, нараджацца і на нашай зямлі, нават у нашай вёсцы.

Пісьменніцкія біяграфіі дапаўняюць іх творы — казкі, апавяданні, вершы, урыўкі з аповесцей. Напрыканцы кнігі змешчана «Скарбонка мудрых думак». Вось што гавораць героі дапаможнікахрэстаматыі, напрыклад, пра кнігу: «…дзівосны свет, па якім можна вандраваць, не выходзячы з дому» (Алесь Бадак), «…паветра душы» (Уладзімір Ліпскі), «…цэлы свет, без якога чалавек ідзе па жыцці як з завязанымі вачыма» (Алена Васілевіч). А вось слова пра школу: «…скарбніца ведаў» (Алесь Бадак); «…бурлівы акіян, уражанні ад якога не пакідаюць усё жыццё» (Алена Стэльмах»; «…шырокае кола, на якім дзяцінства шпарка едзе ў юнацтва» (Анатоль Бензярук); «…чароўны куфэрак, у якім складзены веды» (Генадзь Аўласенка); «…вулей, знітаваны з бясконцым Сусветам» (Уладзімір Ягоўдзік).

Завяршаюць кнігу метадычныя аспекты працы з біяграфічным матэрыялам на ўроках літаратурнага чытання ў пачатковай школе Ірыны Буторынай «Як зрабіць урок чытання любімым». Метадыст, педагог адказвае на пытанні: якой мэце падпарадкаваны ўрокі класнага і пазакласнага літаратурнага чытання? як выглядае формула ўдалага ўрока чытання? для чаго ў класе патрэбны куток чытання? у чым заключаецца метадычная вартасць кніжных ведаў? на што неабходна звярнуць увагу перад першым знаёмствам з біяграфічнымі звесткамі пра аўтара? як выклікаць цікавасць вучняў да біяграфіі пісьменніка?

Дапаможнік-хрэстаматыя, падрыхтаваны Ірынай Буторынай, выйшаў з *QR*-спасылкай на відэаролікі пра жыццё і творчасць пісьменнікаў. Наяўнасць дадзенага відэакантэнту на сайце *p-shkola.by* забяспечвае выдавецтва «Адукацыя і выхаванне». Як падказка на заўтра: калі ў кнігі будзе працяг, то, несумненна, варта ўключыць у новае выданне і матэрыялы, звязаныя з творчасцю такіх пісьменнікаў, як Людміла Рублеўская, Андрэй Федарэнка, Валеры Гапееў, Георгій Марчук, Аляксей Якімовіч, Алесь Жук, Уладзімір Карызна, Таццяна Мушынская, Сяргей Панізнік.

Мікола МІРШЧЫНА

Інтэрнэт-бяспека для дзяцей — лёгка і проста

У XXI стагоддзі важна ведаць, як засцерагчыся не толькі ў рэальным свеце, але і ў інтэрнэт-прасторы. Як данесці гэта да дзіцяці? Як растлумачыць асновы бяспекі ў інтэрнэце? На гэтыя пытанні дапамогуць адказаць казкі беларускага пісьменніка Анатоля Бутэвіча «Прыгоды Віруса Шкодзі» («Беларуская Энцыклапедыя імя Пятруся Броўкі», Мінск).

Казкі Анатоля Бутэвіча як ніколі актуальныя і запатрабаваныя. У сучасным свеце амаль усе дзеці карыстаюцца тэхнікай і заходзяць у інтэрнэт. Але часта справа не абмяжоўваецца праглядам мультыплікацыйных фільмаў, гэта і гульні, чытанне, перапіска з аднагодкамі. Таму важна з самага дзяцінства прывучаць дзяцей да кібербяспекі. Распавядаць, напрыклад, пра тое, чаму нельга ўводзіць асабістыя даныя на незразумелых, «вірусных» сайтах, чаму заўсёды трэба дачытваць дакументы да канца і асаблівую ўвагу надаваць таму, што напісана дробным шрыфтам. Навошта патрэбен «антывірус». Нават базавыя веды дапамогуць засцерагчы сябе і дзіця. Але як даць гэтыя базавыя веды? Кожнаму бацьку і педагогу дапамогуць казкі Анатоля Бутэвіча «Прыгоды віруса Шкодзі». Дзякуючы ім чытачы здзейсняць займальнае і пазнавальнае падарожжа ў зусім іншы свет. Яны трапяць у каралеўства Сусветнае сеціва, у якім мудра і справядліва кіруе Віндаўс Вялікі. Пазнаёмяцца з жыхарамі каралеўства — сеціўцамі — і з галоўным камп'ютарам Кампам Кампавічам. Даведаюцца пра Віруса Шкодзю і пра тое, як ён перашкаджае сеціўцам і іх краіне добра жыць і квітнець. Менавіта тут дзеці змогуць даведацца аб тым, як змагацца з камп'ютарным вірусам, пазнаёміўшыся з доктарам Антывірусам.

Анатоль Бутэвіч у лёгкай форме змог растлумачыць складаныя рэчы, якія сёння важна ведаць усім. А выкарыстаныя ім простыя і ўсімі вядомыя выразы тыпу «што не ў казцы расказаць, не пяром апісаць» ці «жыць-пажываць і дабро нажываць» не выглядаюць заштампаванымі — наадварот, дапамагаюць паглыбіцца ў чароўны свет казак, зазнаць асаблівыя пачуцці.

Алеся ЧАЧУРА

розгалас

Такое рознае каханне…

Мы, былыя студэнткі філфака БДУ, а цяпер — настаўніцы, пастаянна чытаем газету «ЛіМ». У адным з нядаўніх нумароў была змешчана рэцэнзія Яўгеніі Шыцькі на раман Яўгена Хвалея «А на беразе тым…» Нам падаецца, што аўтарка не зусім дакладна вызначыла галоўную ідэю твора, супрацьпаставіўшы паняцці «свой» і «чужы», у сэнсе «суайчыннік» і «замежац». На нашу думку, не ў гэтым ідэя твора, вось яна: супрацьпастаўленне аднаго «кахання» іншаму — кахання на адну ноч Алы на востраве Крыт, у якім былі меркантыльныя мэты гераіні, каханню Аліны на працягу трыццаці гадоў на сваёй зямлі, дзе жанчына ўвесь час заставалася «незабудкай сэрца».

Супастаўленне дзвюх вельмі непадобных жанчын і месцаў дзеяння ў рамане — своеасаблівае. Складаецца твор з дзвюх частак — «Лоўчыя райскай птушкі» і «Незабудка сэрца». Ужо назвы маюць свой падтэкст. У першай дзейнічае «зусім маладая жанчына» Ала, студэнтка-выпускніца, якая задумала… «паляванне» на замежнага жаніха. У другой — «добра выпрабаваная жыццём» Аліна Вітальеўна, выкладчыца каледжа, якая праз шмат гадоў вяртаецца да свайго былога каханага Івана, цяпер дацэнта ўніверсітэта. У герояў напярадзе — жаданы бераг надзеі, кахання. Іх будуць не толькі пяшчотна лашчыць атласныя пялёсткі руж, але і падпільноўваць вострыя, колкія шыпы.

Ад такога супастаўлення драматычнае напружанне не пакідае на працягу ўсяго развіцця сюжэта. Аўтар пераканаўча паказвае, дзе і ў чым сапраўдная сутнасць кахання. Што лепей: лёгка, з марскім брызам жыць на цёплым Крыце ці не страціць самае святое — Радзіму, родную зямлю, мову?

Аўтар па-мастацку праводзіць чытача па сцяжынцы сваіх перакананняў, дэманструючы асэнсаваныя высновы ў эпізодах.

У рамане часткі не дапаўняюць адна другую, а супрацьпастаўляюцца. У гэтым бачыцца глыбокая думка. Маўляў, глядзіце, параўноўвайце, як, бывае, змяняюцца з часам адносіны да кахання. Сённяшнія «лоўчыя» (хітрыя, прагматычныя) жадаюць умомант ухапіць за хвост з усімі выгодамі «райскую птушку» кахання. А «незабудка сэрца» застаецца чароўнай кветкай і трыццаць гадоў для таго, хто быў некалі моцна закаханы.

Чытачу цікава назіраць і рабіць высновы, як кахае сённяшняя студэнтка, учарашняя вучаніца, Ала і — трыццацігадовай даўнасці студэнтка Аля. Гэта — супрацьлегласць. Калі Ала ў першы ж вечар спакусіла на Крыце Петраса, завабіўшы яго на бераг мора, збегшы нават з вяселля сястры, то Аля толькі праз некаторы час сарамліва пацалавалася з Іванам. Яна дбала найперш пра вучобу. І нават тады, калі студэнтка Аля стала вопытнай настаўніцай Алінай Вітальеўнай, а студэнт Іван — дацэнтам Янам Пятровічам, паміж імі былі вельмі далікатныя інтымныя адносіны.

Тыповыя героі паказаны ў творы: станоўчыя і адмоўныя, сумленныя і хцівыя, сардэчныя і жорсткія. Пастаўлены пытанні маралі, прыстойнасці, чалавечнасці. Маляўніча апісаны астравы Крыт і Пальмадэ-Маёрка, дзе часткова адбываюцца падзеі рамана. Гэтак жа па-мастацку адлюстравана і беларуская прырода: «Іван і Ларыса пайшлі на бераг любавацца вячэрняй ракой. Цяпер яна была асабліва прыгожай. Сонца ўжо напалову апусцілася за небасхіл, другая палова гарэла, ззяла над зямлёй, адбіваючыся ў Нёмане. Уражанне было такое, што нібыта жар-птушка плавала ў рацэ». Цудоўны малюнак! Што да мастацка-выяўленчых сродкаў твора, то ён напісаны жывой, сакавітай мовай, якая ўзмацняе замілаванне сюжэтам рамана. Мы, філолагі, асабліва гэтаму радуемся.

Пражыўшы жыццё, стаўшы сталымі настаўніцамі, усё роўна не забываецца непаўторная, рамантычная пара студэнцтва… Дзякуй аўтару рамана «А на беразе тым…» і за гэтую дарагую нам згадку.

Ганна КРУК,
Ала КУКСАВА

Мікола МЯТЛІЦКІ

Гарбаты лес

У лесе Гарбатым —
гарбатыя сосны,
Бы кожны тут год — год высакосны,
Бы сіла нячыстая, што не міргне,
Камлі маладыя ў крывуліны гне,
Бы лес той адным і заселены злом…
Не! Гэта ўсяго толькі разлом
Кантынентальных падатлівых пліт
Лесу прыдаў страшны той від.

Кажуць: не там, дзе трэба, узрос.
Смешны, гарбаты, кляне ўласны лёс.
Птушкі і тыя баяцца бываць,
Голасна песні ў кронах спяваць.
Нават звяры не выходзяць з нары,
Спудна чакаюць змрочнай пары.

Як жа гарбатаму быць і расці,
Дужыя сокі карэннем знайсці,
Гожа стаяць каб — сасна пры сасне,
Птушак вітаць і ўсміхацца вясне?

* * *

І над нашымі мірнымі хатамі,
Што на сонцы вясны зіхацяць,
Жураўлі Расула Гамзатава
Белым клінам стамлёна ляцяць.

Узіраюся ў неба пагоднае —
У вячыстай густой сіняве
Зноў з курлыканнем племя нам роднае
У таемную вечнасць плыве.

А былі ж яшчэ ўчора салдатамі,
Білі смерць на айчыннай зямлі…
І над нашымі мірнымі хатамі —
Жураўлі, жураўлі, жураўлі…

* * *

Спакойна сябе пачуваў
той, што галовы сек.
Прыстойным сябе лічыў
і думаў, што ён — чалавек.
І праца ў яго была
не горшая, як у другіх.
Спакойна ўздымаў тапор —
не рэзала крыкам слых.
Спакойна вяртаўся дамоў,
жаваў свой зароблены хлеб.
Ад рэк чалавечай крыві
не ўздрыгнуў і не аслеп.
І чуты душой спакой
трывалаю быў сцяной,
Жалезнае сэрца нёс
пуцінаю ён зямной.
Звысоку глядзеў на люд,
што абступаў эшафот,
І ведаў: усе яму
глядзяць у прыкрыты рот.
Ён богам лічыў сябе —
бязлітасна ўсіх караў.
Ды тросся касцямі ўвесь —
ад старасці паміраў.
Умольна Нябёсы прасіў…
Хацеў бы ён жыць ды жыць!
Не верыў, што смерць магла
самога яго дабіць.

Крумкач

Змарнеў стары крумкач,
вятрамі крэпка біты.
Падкраўся да свінога ён карыта,
Ды, спуджаны, на дрэва узляцеў —
Адпомсціць гаспадыні захацеў
І каркаць стаў, угневана даводзіць,
Што па зямлі яна астатні тыдзень
ходзіць!

Старая гнеўнай люстасці не ўчула,
Пра крумкача падумала прачула:
«І птаха во ад холаду трасецца!..»
І добрае яе, жывое сэрца
Да птушкі жаласць гэткую займела,
Што тут жа памякчэла, падабрэла.
Прынесла крумкачу скрылёчак сала.
І тым сябе ад згубы ўратавала.

* * *

Што там у будучым
бліжнім прытоена?
Ведаць бы загадзя: якое яно?

Лейстры якія вынайдзе ўдумнае?
Будзе грымучае ці будзе бясшумнае?

Будзе злавечае ці мудра ціхае?
Дасць чалавеку спакойна аддыхацца?

Што ж там у будучым дальнім прытоена?
Ведаць бы загадзя: якое яно?

Ці чалавек ужо ўрэшце нацешыўся
Прагай вандроўнай і занава спешыўся —

Ходзіць планет ім адкрытых прасторамі,
Пераглядаецца з блізкімі зорамі.

Між драбнаты іх Сонца пабачыўшы,
Ўдзячнасцю чутай у сэрцы пазначыўшы,
Ўспомніў,
што продкі жылі там дзесь некалі,
Па-беларуску цекалі, дзекалі.

* * *

Вярнуцца б, дайсці — ды таго не бывае —
У дні і гады, дзе матуля жывая.

У вочы глядзець яе — не наглядзецца,
І постаць адчуць, прыгарнуўшы да сэрца.

Стаяць, як стаяў пасля дальняй дарогі,
І чуць, як дранцвеюць знямелыя ногі.

А потым, за стол сеўшы, нагаварыцца.
Убачыць — слязінка на зрэнцы іскрыцца.

Усмешка забралася ў вуснаў куточкі.
Блакітных вачэй васількі-васілёчкі.

І тая ж над пасмай сівенькай хусцінка.
І ласка і шчырасць: «Паеш чаго, сынку…»

* * *

Той, хто першым пакрочыў,
вярнуўся даўно,
Шар зямны абагнуўшы увесь.
Ды зашмат хадакоў на шляхах не відно,
Што за светам згубіліся дзесь.

Хто забавіўся ў землях прывабных чужых,
Хто наогул забыў родны край.
У бурлівым жыцці не раўняйся на іх —
Душу, сэрца — Айчыне аддай!

Не такія і ўдачнікі лёсу яны,
Каб ад зайздрасці кожнаму млець.
У магілах далёкай чужой стараны
Будуць косці забытыя тлець.

Ведай: толькі радзімая здатна зямля
Уваскрэсіць жывою вадой —
І цяпер, у жыцці, і па смерці, пасля,
Быць заступніцай вечнай тваёй.

* * *

Колькі бронзы пайшло — тысячы тон,
Каб разбудзіць гісторыі сон,
Помнікі па ўсім свеце адліць
Тым, хто не даў нам падзеі забыць
Часу былога: у бронзе стаяць
Тыя, хто нам прагне спрыяць.

Колькі свінцу пайшло — тысячы тон,
Каб напаткалі хуткі свой скон
Тыя, што праглі жыццё зруйнаваць, —
Ім не ўваскрэснуць, з магілы не ўстаць.
Не заявіцца ценем начы
Тым, хто каваў згубы мячы.

* * *

Куды ні пойдзеш — вернешся назад:
За далягляда — новы далягляд
Адкрыецца заўсёды спакваля.
І ты паверыў: круглая Зямля,
Прайшоўшы свет, вярнуўшыся назад.
За далягляда — новы далягляд.

Каб не пайшоў і свет каб не схадзіў,
Таго б ніколі, пэўна, не адкрыў,
Усе вякі да гэтай бы пары
Сядзеў як крот, схаваўшыся ў нары,
І быў бы цемры беспрасветнай рад…
За далягляда — новы далягляд.

І ты адкрыў — увесь! —
зямны прастор,
Нацэліў вока на скапленні зор.
І ведаеш: на грунце іх планет
Расшырыцца твой неабсяжны свет,
Праляжа шмат касмічных «аўтастрад».
За далягляда — новы далягляд!

* * *

Як маятнік Фуко,
гайдаецца сэрца маё —
Рысу выпісвае ў часе някметную,
Тонкае, чуйнае, як вастрыё,
Над гэтай жахотна
трывожнай планетаю.

І кожны дзень новы —
між «быць» і «не быць» —
Б'юся з пагрозамі да знемажэння.
Добра таму, у кім век цэлы спіць
І не прачнецца ніколі сумленне.

О не, ці варта зайздросціць яму,
Ачэзламу, душой прахаладнаму?
Я лепей жаўранка долю прыму,
Што толькі спявае полю роднаму.

* * *

Я стаміўся пісаць пра сусветны кашмар.
Хіба гнеўным радком згубны вір астуджу?
Век наносіць паўсюд за ударам удар,
Закаваны ў драпежнасці хіжай імжу.

Я стаміўся пісаць —
іскры гневу красаць…
Гневу поўны радок сэрцы ці скалане?
Толькі я не паверу, што сэрцам —
згасаць.
Калі станецца так —
вінавацьце мяне!

Ты — паэт,
ты ў адказе за ўвесь белы свет,
І надзеі агонь ты павінен красаць.
Дык які ж ты, прызнайся самому, паэт,
Калі з болем даводзіш: стаміўся пісаць?!

Не! Стамляцца не смей!
Надта ж страшныя дні.
Ты крывёю пішы, як дагэтуль пісаў,
Ад распаду душы белы свет барані,
Каб у кожных грудзях
мужны дух не згасаў.

Ганна АТРОШЧАНКА

Яшчэ не восень...

Да восені далёка сёння,
Зялёны клён шчэ шамаціць.
З нябёсаў, з сіняга бяздоння
Віецца жнівеньская ніць.

Сярод бяроз блукае лета,
Нас кліча ціха, пазаве.
Зямля пяшчотаю сагрэта,
Як кветка сонцам у траве.

Расінкі, ясныя вясёлкі
І на траве, і на зямлі...
Хай вабяць пчолак кветкі, зёлкі
І карагод вядуць чмялі.

А жнівень — яшчэ не журлівы,
І сад стары наш не пусты!
Гучаць там ранкам пералівы,
Птушыны хор яшчэ густы.

Увосень

Прыпыніся, цяпло, на хвілінку,
Не знікай, я прашу, не знікай!
Не фарбуй жаўцізною сцяжынку,
Луг зялёны, бярозавы гай.

Песня сумная сёння аб леце
Адзвінела даўно ў цішыні...
Восень жоўтая бегла па свеце,
Фарбавала журботаю дні.

На палетках даўно жыта зжалі,
А на ржышчы валошкі ў журбе.
Без турботы і нават без жалю
Вецер клёнік пяціху скубе.

Ліст ляціць у паветры самотны,
Развітанне прышле з вышыні.
Летні час ужо стаў незваротны,
І няма, як раней, мітусні.

Фота Каструся Дробава.

Таццяна ДЗЕМІДОВІЧ

Прыметнікі шэрых будняў

Апавяданні

Шаснаццатая...

Шаснаццатая скрыня заўсёды была пустая... Паштовы апендыкс пятнаццацікватэрнага пад'езда пастаянна забіваўся смеццем. І тата перажываў. Я тэлефанавала яму, пыталася:

— Як справы?

І ён казаў:

— Дрэнна! У пустой скрыні зноўку пажваканыя паперкі, пясок, парэзаная гума і нейкія запчасткі ад старога гадзінніка...

— А што ў свеце? Што там па тэлевізары? — я аддалялася ад татавага мікрасусвету…

— Не глядзеў, бо ціск узняўся! — змрачнеў тата... Дакладна змрачнеў — я гэта адчувала.

— Не думай пра дробязі! У Еўропе чуў? Паводка... У Ірландыі вулкан прачнуўся! А яшчэ малакавоз перавярнуўся... Не памятаю дзе, але перавярнуўся, а тут звычайная паштовая скрыня, добра прымацавана, спакойна вісіць ды яшчэ багацее на ўсялякі хлам, — супакойвала я.

— Акрамя мяне, ніхто пад'езд не прыбірае, — злаваўся тата.

— Ты таксама не прыбірай! Навошта ў тваім узросце напружвацца...

— Дык прыбіраць няма каму, — упарціўся ён. — У Ірыны з пятай кватэры дзетак трое, Сямёнавы паўгода як на дачы жывуць, Пятровы...

— Тат, мне таксама няма калі, — я паглядзела на гадзіннік, — давай я табе сабачку куплю, будзеш з ім гуляць...

— А калі памру, куды вы яго? Табе ж няма калі, — уздыхае тата.

Цяпер ужо я цяжка ўздыхаю:

— А давай заўтра мы прыедзем і адпілім гэтую скрыню ад секцыі...

— Справа не ў скрыні, — сумным голасам сказаў тата. — Учора мне дзвярное вочка хтосьці заклеіў. Спецыяльна! Помсцяць за парадак.

— Тат, беражы сябе, ну іх усіх! — усхліпнула я.

Папін дэтэктыў з шаснаццатай скрыняй сядзеў у мяне ў галаве да ранішняй кавы. За пяцьдзясят пяць гадоў столькі жыхароў змянілася ў доме... «Цікава, хто гэты злодзей, які рэжа гуму, жуе папяру, збірае ржавыя цвікі і асколкі шкла? Дарэчы, яшчэ там былі арэхі і пабіты пясочны гадзіннік», — разважала я... да першай лыжкі цукру. Потым кава стала салодкай, зазвінеў мабільнік...

Позна ўвечары зразумела, што забылася патэлефанаваць тату. Сэрца трывожна ёкнула. Згадала паштовую скрыню і потым, як мы на пачатку дзевяностых усім пад'ездам рабілі рамонт. Мужчыны сцены і парэнчы фарбавалі, жанчыны фіранкі на вокны пашылі, былі і кветкі ў самаробных гаршках. Стала шкада татулечку. Усё лета перажывае з-за гэтай скрыні. Ціхенька паплакала. Напісала яму СМС: «Не спіш?»

У адказ прыляцела карцінка з задаволеным мульцяшным катом і кароткае «Зараз патэлефаную».

Правадны тэлефон падаў голас.

— Тат, як ты? — узняла я трубку.

— Цяпер я ведаю, хто разводзіць бруд у шаснаццатай!

Па голасе зразумела, што ён шчаслівы.

— А я адразу казала — трэба ў міліцыю тэлефанаваць!

Тата задаволена засмяяўся:

— Самі басякі прыйшлі, і цяпер я згараю ад сораму!

— ???

— З пяцігадовымі дзецьмі ваяваў, — весела адказаў тата.

— ???

— Учора пазваніў у дзверы Ірчын хлапчук, а побач з ім карапузы стаяць, значна меншыя. Рукі ў бакі, бровы насупілі, сур'ёзныя такія: «Дзядуля, ты навошта наш штабік усё лета разбураеш?» — «Які штабік?» — кажу я. «Шаснаццаты», — кіўнуў на скрыню малы. «Ах, дык гэта вы шкоднічаеце!» — разлавацца я. А малы на поўным сур'ёзе і кажа: «Гэта не шкода, а абломкі касмічнага карабля і марсіянскі грунт — мы яго вывучаем у спецыяльнай лабараторыі». Малеча паказаў скрынку ад абутку: «Заўтра ў штабік цукерак пакладу, — задаволена сказаў тата. — Будучым навукоўцам неабходна салодкае».

— Лепш вафлі «Артэк»... Хай мараць на наступны год паехаць у дзіцячы летнік! — усміхнулася я.

Засынала спакойна, бо прыдуманыя марсіяне ведаюць толк у караблях і ў тым, куды і калі трэба прызямліцца, каб усе былі шчаслівыя...

Узроставае

Кактус быў падарункам ад цёткі Каці. Пажылая жанчына сказала, што ён паглынае радыяцыю і два разы на год дзівосна цвіце. Кактус быў высокім, шырокім і плоскім прыгажуном. Мы адразу вызначылі, дзе ў яго профіль, а дзе анфас, таму што ён сваім выглядам нагадваў нам каханага мужчыну... У маёй калегі па працы фаварытным мужчынам быў былы хлопец, а я ў кактусе бачыла свайго куміра — саліста аднаго папулярнага музычнага гурта. Увогуле, там, дзе Ларыса пазначыла для сябе контуры вялікіх валасатых вушэй і ссунутага гарбатага носа, я бачыла кудзеркі, якія дзівосна развіваліся, і мікрафон, за якім хаваліся рысы твару.

Але кактус не здагадваўся, як «ён нам дарагі»: па вечарах ствараў цень на паперах, пры любым неасцярожным руху мы чапляліся за яго шыпы… Гэта было балюча да часання і затратна па часе, бо даводзілася потым у сумачцы шукаць пінцэт і доўга вывуджваць пад скурай стрэмкі. А яшчэ мы часам праветрывалі кабінет, і кактус разам з гаршком з'язджаў уніз. Стары гаршчок пакрываўся новымі сколамі-маршчынамі, а пясок... Мы яго збіралі, як іголкі на сукенцы, доўга... да наступнай пятніцы, гэта значыць, да прыходу прыбіральшчыцы.

Зразумела, мы даўно пазбавіліся б ад падарунка. Толькі цёця Каця ў нашым бюро паслуг была пастаянным кліентам. Яна архіварала свае паперы, сканіравала старыя фатаграфіі і ксеракапіравала ўсё каштоўнае для сябе: ад старых паштовак да працоўнай кніжкі свайго памерлага мужа.

Потым я прапанавала паставіць кактус у кут. Канешне, цёця Каця была незадаволена такім паніжэннем для кактуса. Яна лічыла, што расліне не хапае святла, да таго ж ёй было на новым месцы няўтульна: дзверы краналі «вушы-кудзеркі». Нарэшце, Ларыса праявіла цвёрдасць, таму што хопіць ужо скакаць пад дудачку цёткі Каці... Яна адправіла расліну ў прыбіральню.

Цётка Каця прыйшла хутка... Разгублена і засмучана паглядзела па баках:

— А дзе кактус... мой?

— А няма яго... — усміхнулася я: — Пераехаў у іншы кабінет.

Цётка Каця пачырванела, злосна падціснула вусны:

— У які такі кабінет?

Я спалохана паглядзела на Ларыску.

— Ларыса яго... гэта вось... туды занесла...

— Куды гэта туды? — не зразумела цётка Каця.

— На гігіенічныя працэдуры мы яго насілі! Гаршчок памылі, лісце працерлі, зараз прынясу! — знайшлася Ларыска.

Праз тры хвіліны кактус стаяў на сваім звыклым радыяцыйна-паглынальным месцы... І я не ведаю, чым скончылася гісторыя суіснавання супрацоўнікаў бюро паслуг з кактусам і сяброўства з цёткай Кацяй, таму што перайшла на іншую працу.

Ларысу выпадкова сустрэла перад майскімі святамі гадоў праз дзесяць. Успомнілі кактус.

— Зацвіў? — пытаюся я.

— Не памятаю, — кажа Ларыса. — Цяпер з гэтым кактусам хутка б разабраліся.

— Разабраліся б, — кіўнула я.

І мы змоўклі... Разумеючы, што ўсё гэта няпраўда.

Таму што з гадамі чалавек становіцца цярплівым да чужых кактусаў.

Фарбаваная

Вера заўважыла яго адразу: ён быў вышэйшы за ўсіх, напышлівы, чымсьці незадаволены. І ўжо з сівізной ускалмачаных валасоў, мятай няголенасцю па адрузлай скуры, дарожкамі маршчынак у злёгку апушчаных павеках.

— Колькі яму? Гадоў пяцьдзясят... — шапнула яна мне. — Так табе і трэба, мача!

Верчына радасць была нядобрая, але імгненная. Бо і наша маладосць таксама хавалася цяпер пад сетачкамі першых маршчынак...

Верка асцярожна азірнулася, яшчэ раз прабеглася позіркам па чарзе. Стала холадна і мне... Зусім зябка... Сяброўка пачала злавацца на мужа за тое, што ён адправіў яе рэгістраваць іх новую машыну, і яна па дурасці нацягнула вязаную шапачку і лёгкую блакітную куртку. А ў шафе вісіць футра, якое ў гэтым сезоне наогул не апранала, таму што нямка ў ім хутка хадзіць. А павольна хадзіць няма калі.

І вось нечаканая сустрэча… І Верка, амаль не дыхаючы, перабірала ў галаве ўспаміны… І я прыпамінала яе стройнай прыгожай дзяўчынкай з іншым, прыдуманым спецыяльна для яго, імем, іншым колерам валасоў, у просценькай сукеначцы пад колер выразных валошкавых вачэй…

…А Гогу апаноўваў гнеў. Ён выштурхваў з чаргі поўную жанчыну, якая стаяла наперадзе, рыкаў, як стары раз'юшаны леў, выкрыкваў грубасці. Тая спрабавала абараняцца, у адзіночку, бо ўсе зрабілі выгляд, што не іх праблема. Завязалася сварка, сэнс якой ні Вера, ні я не ўхапілі. Мая сяброўка прыгорбілася, імкнучыся быць непрыкметнай... У гэты момант я ўспамінала, як даўным-даўно яна ледзь не закахалася ў яго... Вядома, Верка не думала, што час зраўняе іх, звядзе ў адной чарзе і што пазнае яна свайго «героя» па гэтай выслізнулай брыдоце...

* * *

...А ў дзевяностыя Гога прадстаўіўся дырэктарам гандлёвай фірмы, паказаўся чалавекам дзелавым і сур'ёзным. Мужны, амаль дэспатычны выраз твару, вішнёва-тытунёвы пах салона машыны, лаканічнасць размоў і спатканняў.

Некалькі разоў на тыдзень ён пад'язджаў да Верчынага дома, усаджваў яе ў салон машыны, а потым знікаў у бясконцых званках па мабільным тэлефоне... Няварта казаць, што дваццаць гадоў таму мабільнік быў рэччу і рэдкай, і дарагой.

Верка па-дзіцячы падцягвала пад сябе ногі, размясціўшыся на заднім сядзенні, і баялася парушыць гэтае дзелавое таямніцтва. Гога скоса глядзеў на яе, усміхаўся, падміргваў і ўсё працаваў, працаваў... Яго голас рэдка быў мяккім… Гога пастаянна зрываўся, нешта даказваў...

І Верцы здавалася, што яна абавязкова павінна дарасці да яго мудрасці, а цяпер ціха і захоплена трэба маўчаць. Нарэшце пасля дзіўных азнаямленчых спатканняў, якія мы ўвесь час з Веркай абмяркоўвалі, ён патэлефанаваў і запрасіў яе на пікнік з сябрамі. Яны сустрэліся раніцай, як заўсёды, каля парога хаты. Гога крытычна паглядзеў на Верку і грэбліва паморшчыўся:

— Не, у гэтай сукенцы ехаць нельга! Дзяшоўка! Падскочым у краму!

Дзяўчына выракла вочы і замерла. Гэту яркую паркалёвую сукеначку ёй пашыла мама… Любімая рэч у гардэробе. Верка ў гэтай сукенцы была асабліва светлай! Па дарозе ў краму Гога нервавацца, і Верка непрыемнай дрыготаю ў целе адчувала сваю віну: бо спатканне аказалася элітным, а яна не дадумалася падрыхтавацца... Дворнікі размазвалі лятучую машкарню па шкле, надвор'е было даволі хмурным. Раптам Гога націснуў на тормаз — наперадзе быў нерэгулюемы пешаходны пераход. Верка заплюшчыла вочы, рэзка хіснулася наперад і ў думках узрадавалася, што прышпілена.

— Карга старая! — крычаў Гога.

Гэта ўсё, што яна магла разабраць у яго нецэнзурнай лаянцы. Сэрца моцна білася ў грудзях… Пажылая жанчына паспела перайсці дарогу, але спатыкнулася аб бардзюр і ледзь не ўпала. Яе трэсла і хістала. Выскачыўшы з машыны, Верка схапіла з зямлі яе торбу з прадуктамі і чамусьці расплакалася.

— Хопіць мачаліць соплі! Сядай! — загадным тонам крыкнуў Гога.

— Ідзі, дзетка! Дзякуй Богу, жывая! Спяшайся далей па сваіх справах!

Бабуля перахрысціла Верку на дарожку і нібы развяла ўсё па сваіх месцах — дзе шчасце, дзе лёс, а потым павольна пайшла да тралейбуснага пустыннага прыпынку.

— Сядай, каму сказаў! — рыкнуў на Верку Гога.

Яна моўчкі пакруціла галавой...

— Чаго стала, дурніца? — Гога нервова стаў ціснуць на клаксон.

Верцы здавалася, што з кожным гукам Гога на кавалкі раздзірае яе свабоду, танкам едзе па полі яе чыстых ясных валошак, знішчаючы цеплыню чакання першых пяшчотных пачуццяў...

Раздаўся гук падыходзячага тралейбуса. І Верка рванула з усіх ног да прыпынку...

* * *

Пры ацэнцы новай машыны Верка з Гогам усё ж такі сутыкнулася твар у твар. Я заўважыла, як сяброўка хутка адвяла вочы ў бок, Гога акінуў яе нябачным поглядам і зноў пачаў настойліва выпытваць нешта ў ацэншчыка.

— Мужчына, пачакайце, не ўсё адразу! — спыніў яго жэстам супрацоўнік ДАІ. Ён папрасіў у Веркі пашпарт. Уважліва паглядзеў на фота, на машыну, потым зноў на Верку і перапытаў:

— Фарбаваная?

Пашпарт Верка даўнютка не мяняла і на фота была бландзінкай, а ў жыцці — цёмнай шатэнкай.

— Прычым тут колер маіх валасоў? — здзіўлена і нясмела спытала Верка, сцягваючы з галавы вязаную шапачку.

Ацэншчык расплыўся ў шырокай усмешцы:

— Дык я пра машыну пытаюся — перафарбаваная яна ці не?

За спінай раздаўся гучны смех. Верка не бачыла, ці быў у гэтым натоўпе Гога альбо кудысьці адышоў... Не бачыла гэтага і я.

— Сорамна ж як! — калі ўсё скончылася, узялася за галаву Верка.

— Я таксама падумала пра пашпарт! Займальна атрымалася, — мне давялося стрымлівацца, каб зноў не засмяяцца.

Вярталіся дадому, успомнілі шмат усяго вясёлага ды і не толькі! ...Пра Гогу — ні слоўца… Бо жыццё, колькі яго не перафарбоўвай, заўсёды захавае твой сапраўдны твар. І я думаю, што Гога пазнаў Верку... Па вачах валошкавага колеру...

Літаратура і мастацтва № 33 20 жніўня 2021 ЛіМ

Ненатольная прага хады

Лягчэй за ўсё параўноўваць чалавечае жыццё з той самай доўгай дарогай, на якой пражытыя табой гады — толькі нейкія верставыя слупы. Такое, верагодна, задавальняе паэта, але ніколі не задаволіць самога хадака, які ведае, колькі каштуе кожны крок на гэтай дараванай Богам дарозе, як давалася яму сама хада. А жыццё чалавечае не жадае супыну, бо не мае яго і сам час. Заўсёды на зямлі недзе ідуць ці малыя, ці вялікія войны, руйнуюцца імперыі, падаюць троны, нараджаюцца новыя геніі. Старэем мы, сталеюць нашы дзеці, падрастаюць унукі. Адны людзі адыходзяць з гэтага жыцця, а іншыя прыходзяць у яго.

У гэтай жыццёвай несупыннасці і пераемнасці кожны чалавек заўсёды абапіраецца на посах сваёй памяці. А чым жа яшчэ, як не памяццю, і моцны, і дужы чалавек. Мабыць, таму мяне так і здзівіла разважанне маладога яшчэ тады аўтара Алеся Марціновіча, якое я толькі сёння адкрыў для сябе, а некалі проста перагарнуў старонкі яго першай крытычнай кнігі з такой унушальнай назвай «Далучанасць». Аўтограф сведчыць, што кніга падпісана мне 4 верасня 1990 года, у хуткім часе пасля таго, як выйшла з друку. І вось радкі з яе, якія б мне хацелася сёння працытаваць: «Будуць праходзіць новыя месяцы, мінаць гады, можа, нават атрымацца і так, што калі-небудзь у жыцці тваім настане момант, калі перад шырынёй і значнасцю новых далягляданў тое, учарашняе, амаль што дзіцячае, падасца дробязным, не вартым асаблівай увагі. Сентыментальным нават. Не спяшайцеся, аднак, паліць за сабой масты. Няхай запалка гэтай абыякавасці і раўнадушша да памяці, да ўчарашняга моцна і балюча апячэ пальцы твае, ды так, каб душа ўся ўзварухнулася, каб сорамна і ніякавата стала». Дык як вам такое, усхваляванае ўсім жаданні: наш выпуск 1968 года, які быў першым пасля таго, як аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта "патрапіла" пад чарговую Пастанову ЦК КПСС, дакладную назву якой з цягам часу я запамятаваў, але сутнасць яе зводзілася да таго, што ўказвалася на неабходнасць узмацняць кадрамі раённыя газеты — а каму гэта найперш рабіць, як не маладым спецыялістам! Так я і трапіў у Драгічын, што да ўсяго аказаўся далёка ад Капыльшчыны, дзе жылі мае бацькі, да якіх, будучы студэнтам, наведваўся больш-менш рэгулярна. Цяпер жа, зразумела, падобная мажлівасць знікла, а гэта не сказаць каб прыўзнімала настрой».

Я, хто сам дабравата паспрабаваў «смаку» таго няўседнага і мітуслівага жыцця раёнкі, ведаю, што значыць для творцы засядзецца ў яе хай і ўтульным крэсле. «Колькі талентаў звялося», кажучы словамі земляка, і праз яе, раёнку, таксама. Бо тут, як нідзе, трэба заўсёды, як жартуюць, з лесу ды адразу ў печ. Толькі, бывала, з'явішся з дзённай камандзіроўкі ў калгас — і тут жа адразу садзішся за стол і пішаш тэрміновыя радкі ў набор. Пра нейкую «вынашанасць матэрыялу» нават і гаворкі не можа быць. Таму я добра разумею прыведзенае вышэй прызнанне Марціновіча.

Чаму ён выбраў менавіта крытыку? У яго ўжо на самым пачатку, як казаў я вышэй, бачыліся добрыя задаткі празаіка. Гэтае пытанне я ніколі не задаваў яму, як і не пытаўся, ці пісаў ён калі вершы. Бо адчуванне і разуменне паэзіі ў яго выключнае. Магчыма, гэтая якасць добра слугуе яму і ў яго крытычным шчыраванні. Думаю, сам творчы кірунак падказала яму і праца ў рэдакцыі «ЛіМа», дзе доўгі час набіралася моцы і сталела яго нястомнае пяро. Трапіць у літаратурнае выданне такога маштабу адразу пасля першых крокаў у раённай газеце — хіба не шчасце для маладога журналіста?! Тут жа само паветра, самі сцены спрыяюць творчасці. Чаго варты адны сустрэчы і знаёмствы з калегамі, з вядомымі пісьменнікамі. Ты ў курсе ўсяго літаратурнага жыцця і нават сам прымаеш у ім непасрэдны ўдзел.

Я ў той час працаваў на Рэспубліканскім радыё, дзе нас, можа, нават крыху і зневажальна калегі называлі «літаратуршчыкамі». Добра памятаю, як мы зайздросцілі ім, супрацоўнікам літаратурных айчынных выданняў. У іх жа зусім інакшае жыццё, нават дзень рабочы намнога карацейшы. Значыць, ёсць час і для ўласнай творчай працы. Здаецца, там, у рэдакцыі, мы калісьці з ім упершыню і сустрэліся, і пазнаёміліся. І пры першым жа знаёмстве выявілася, што мелі мы шчасце працаваць у адной і той жа Капыльскай раённай газеце, хоць і ў розныя гады. Нават ужо гэта ў нейкай меры збліжала і надавала даверу. Ды і таварыскасці душэўнай Алесевай можна было пазайздросціць. Убачыў я ў ім чалавека простага, без фанабэрыі. Ён і жарт добры любіць, і размову любую падтрымаць умее. Такія людзі мне падабаюцца. З імі я лёгка сыходжуся. Мы з ім і належым да аднаго пакалення, якое з чыёйсьці лёгкай рукі назвалі калісьці філалагічным. Гэта нібыта нейкі папрок, што наша

Фота Кастуся Дробава.

Алесь Марціновіч.

веданне жыцця замкнута толькі рамкамі філфака. А праз той жа філфак прайшлі і нашы папярэднікі, і паслядоўнікі, і будуць гэтым шляхам ісці іншыя пакаленні.

Пачынаў з філфака і Алесь Марціновіч. Праўда, тут жа перавёўся на журналістыку. Тады нам здавалася, што так прэстыжней. А час засведчыў, што асоба пісьменніка фарміруецца менавіта ў ім, самім часе, на яго дарогах і скрыжаваннях, а не на нейкім там факультэце. «Хто цябе навучыць пісаць, калі ты не маеш таленту!» — сцвярджаў потым і я сам, крыху хапіўшы творчай гарэзнасці. Ці не пра тое ж крычаць і сённяшнія маладыя. На свой літаратурны абсяг Алесь Марціновіч ступаў спакваля, шмат прачытаўшы літаратуры — і класічнай, і сучаснай, добра ўзважыўшы ўсе свае магчымасці і выдатна арыентуючыся ў самім літаратурным працэсе.

Як крытык Алесь Марціновіч пачынаў з кароткіх водгукаў і рэцэнзій на кнігі. Праца рэцэнзента, магчыма, самая няўдзячная, але заўсёды запатрабаваная ў кожным літаратурным выданні. Ведаю гэта, бо і сам у свой час працаваў загадчыкам аддзела крытыкі і літаратуразнаўства ў часопісе «Полымя», падстрахоўваў той жа аддзел, калі быў намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Маладосць». Ведаю, як цяжка часам заказаць рэцэнзію на новую кнігу таго ці іншага аўтара.

Далучанасць для крытыка Марціновіча, які адзначае свой 75-гадовы юбілей, гэта перш за ўсё сумленнасць. Толькі сумленнасць дазваляе яму быць не суддзёй, а добрым суразмоўцам аўтару там, дзе трэба прадчуваць і адчуваць, а часам здагадвацца і нідзе нічога не навязваць. Хай недзе і падказваць, але не вучыць і павучаць, не трацячы пры гэтым веры ў аўтара. І адзіны крытэрый, адна мерка падыходу для кожнага аўтара — сталы той ці яшчэ пачатковец. Да кожнага — з меркай праўдзівасці і сумленнасці. Кожнаму тое, чаго заслугоўвае.

У яго няма нейкага спіса ўлюбёных аўтараў. Але не знойдзеш у пераліку тых, пра каго пісаў Алесь Марціновіч, і імён выпадковых. У абсягу яго ўвагі — не толькі імёны, шырока вядомыя ў краіне і за яе межамі, але і тыя, каго мы яшчэ як след не адкрылі для сябе, але чыя творчасць вартая ўвагі і даўно чакае добрага і шчырага слова. Нібыта сабе самому, але і ўсім нам, ягоным чытачам, у артыкуле пра Івана Мележа ён аднойчы пажадае: «Паспяшайся, браце, скажы добрае слова таму, хто яго заслужыў. Яно ні ў якім разе не будзе лішнім». Гэта пажаданне і ёсць жыццёвы і творчы прынцып вядомага пісьменніка.

Сёння яму зацесна ў рамках толькі аднае крытыкі. І ўжо больш як два дзесяцігоддзі ён плённа працуе ў галіне гістарычнай прозы. Ён шмат рабіў і робіць, вяртаючы нам з мінуўшчыны забытыя імёны. А гэта праца хоць і не простая, але ўдзячная і патрэбная. Алесь Марціновіч добра разумее, што сёння і заўтра будзе патрэбна літаратура, якая б вяртала нам гістарычную памяць, бо нельга будаваць будучыню, не ўсведамляючы і не адчуваючы сваіх вытокаў. Ад вялікіх рэк трэба заўсёды вяртацца да першакрыніц. «Даўно ўжо час разабрацца дасканала ў сваім нацыянальным радаводзе, — зазначае Алесь Марціновіч, — лепей спазнаць багатую гісторыю бацькаўшчыны. А зрабіць гэта можна і пазнаёміўшыся з жыццём нашых выдатных землякоў, хто ў розныя часы праслаўляў сваёй працай, сваім талентам не толькі Беларусь, а нярэдка аказваў уплыў на развіццё ўсяго чалавецтва».

Гэтыя словы ў першую чаргу адрасаваліся самому сабе. Тут жа неўзабаве з'явіўся двухтомнік цікавых і змястоўных нарысаў ды эсэ «Хто мы, адкуль мы…» А далей былі кнігі «Элегіі забытых дарог», «Птушкі з пакінутых гнёздаў», «Маладзік над заснежаным полем», «Пяшчота апалага ліся», «Успамін пра Будучыню»… У яго аўтарскай серыі «Гісторыя праз лёсы», адрасаванай школьнікам, ужо выйшла 10 тамоў. У кожным па тры кнігі. Запланаваны яшчэ два тамы. 236 імёнаў. І ў кожным свой асаблівы змест, вялікая аўтарская праца.

Зацікаўленасць гісторыяй не з'яўляецца сама па сабе. Часцей за ўсё яна ўзнікае ад начытанага, а то і ад прыроднай дапытлівасці. Шмат пра што гаворыць і тое, што нарадзіўся пісьменнік у настаўніцкай сям'і на Случчыне. Словы «ў сям'і настаўнікаў» заўсёды змушаюць глядзець на чалавека з асаблівай павагай, добрым даверам і адкрытасцю. Магчыма, гэта маё асабістае, сялянскае. Здаецца, сваёй шчырасцю, адкрытасцю, паслядоўнасцю і творчай нястомнасцю пісьменнік Марціновіч, сын Андрэеў, і на самай справе апраўдвае мой давер. Ды чаму толькі мой? Усёй нашай літаратуры.

Што тычыць нястомнасці, дык гэтая якасць у Алеся Марціновіча сапраўды, відаць, прыроджаная. Створанае і выдадзенае ім ніяк не ўмесціш на адной кніжнай паліцы. Гэта цэлая бібліятэка аднаго пісьменніка, цэлая кніжная школа, дзе вучнямі абавязкова будуць яны, чытачы будучага. Усё тое, што пісьменнікам вернута з мінулага, адрасавана менавіта ім.

Здаецца, у яго няўтольнай хадзе па жыцці ніколі не было прыпынкаў, была тая хада заўсёды роўнай і ўпэўненай. Не скардзіўся ён і на нейкую няўвагу, амаль не згадваў пра сваё сумнае ды балючае. Як быццам не сутыкаўся з ім. Ды не, скажа ён сам, так у жыцці не бывае. Пра самае балючае ўсё-ткі сказаў аднойчы, але чамусьці ў гумарыстычнай кнізе «Былое, але не думы», і ў самым канцы. Было і ў яго… А так, здаецца, у гэтым жыцці ён не пакрыўджаны. Мае шмат і ўзнагарод за сваю нястомную працу на карысць Бацькаўшчыны. Ён лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, і званне заслужанага мае, і яшчэ шмат іншых узнагарод.

Мне радасна, што было ў нас з ім шмат розных сумесных сустрэч і дарог. А вось адну, што даўно планавалі, на Капыльшчыну, так і не здзейснілі. Можа, час дапаможа. Шчыра прызнаюся, з ім цікава і на працы, і ў дарозе. Любіць ён і добры дасціпны жарт, падхопіць яго заўсёды, нават калі сядзіць за маніторам рабочага камп'ютара. А без камп'ютара, як і без кнігі, мне яго ўявіць цяжка. Як і без дарогі, як і без ненатольнай хады па ёй. Адчуваю і сёння: прага гэтай хады ў яго ненатольная.

Казімір КАМЕЙША

Далучанасць для крытыка Марціновіча, які адзначае свой 75-гадовы юбілей, гэта перш за ўсё сумленнасць. Толькі сумленнасць дазваляе яму быць не суддзёй, а добрым суразмоўцам аўтару там, дзе трэба прадчуваць і адчуваць, а часам здагадвацца і нідзе нічога не навязваць. Хай недзе і падказваць, але не вучыць і павучаць, не трацячы пры гэтым веры ў аўтара. І адзіны крытэрый, адна мерка падыходу для кожнага аўтара — сталы той ці яшчэ пачатковец. Да кожнага — з меркай праўдзівасці і сумленнасці. Кожнаму тое, чаго заслугоўвае.

Агульны малюнак усяго літаратурнага працэсу можна скласці менавіта па яго артыкулах, шматлікіх эсэ і рэцэнзіях. Ды радкі з гэтай ранняй кнігі сведчаць, хутчэй за ўсё, што перад намі не абяцаны нашай літаратуры крытык, а ўдумлівы, з лірычным ухілам празаік. А ён, як і шмат хто з нас, пачынаў са сціплай раённай журналістыкі. Спашлёмся на біяграфічнае прызнанне самога пісьменніка: «Часта ў думках вяртаюся ў 1969 год, які стаў першым годам маёй газетнай дзейнасці… Апынуўшыся пасля сталіцы ў невялікім гарадку на Брэстчыне (*у Драгічыне.* — **К. К.**), я сумаваў па Мінску, а яшчэ самотлівей станавілася ад усведамлення таго, што не змог замацавацца ў ім, хоць практычна гэта і немагчыма было зрабіць пры

Казімір Петруневіч… у сапраўднасці Петрусевіч

Мала хто з аматараў беларускай літаратуры не чытаў трылогію Якуба Коласа «На ростанях». У яе трэцяй кнізе, што дала назву ўсяму твору, як вядома, расказваецца пра суд над Андрэем Лабановічам. Прываблівае сваёй прынцыповасцю і сумленнасцю адвакат Казімір Петруневіч, «яшчэ малады, відны мужчына, з добрым абліччам», які абараняў яго па справе ўдзелу ў нелегальным настаўніцкім з'ездзе. Паколькі ў памяці ўсё не ўтрымаеш, каб быць дакладным, адгарну ў кнізе неабходную старонку. Ага, вось яна…

Петруневіч узяў слова пасля выступлення абвінаваўцы.

«— Гэта — узор красамоўства, — сказаў адвакат. — На жаль, толькі пракурор згусціў фарбы. Вы паглядзіце, гаспада суддзі і гаспада саслоўныя прадстаўнікі, на падсудных: усё гэта зялёнае юнацтва, веснавая паводка, што не тоўпіцца ў берагах. Не трэба мець злачынную душу і злачыннае сэрца, каб падпасці пад уплыў тых ці іншых асоб, тых ці іншых ідэй і зрабіць памылку. Пракурор у сваёй прамове спасылаўся на залатыя словы паэта-народніка — сеяць "разумнае, добрае, вечнае". Дазвольце і мне спаслацца на генія рускай паэзіі, на бяссмертнага Пушкіна:

И долго буду тем любезен я народу,
Что чувства добрые я лирой пробуждал,
Что в мой жестокий век восславил я свободу
И милость к падшим призывал.

Апошні радок Петруневіч прадэкламаваў як артыст, вымаўляючы кожнае слова асобна і робячы на ім лагічны націск».

Прамова Казіміра Адамавіча не толькі ўражвае, але і захапляе спагадай, чуласцю да падсудных. Разуменнем, што несправядлівасць у дачыненні да іх можа дорага каштаваць. Прываблівае ён і эрудзіраванасцю, што ўжо само па сабе — сведчанне высокай культуры, інтэлігентнасці. Сказанае ім напоўнена жаданнем абавязкова дамагчыся, каб лёсы настаўнікаў не былі зламаны. Петруневіч працягваў:

«— Юнацтву ўласціва кіпенне, бурленне. […] Колькі юнакоў-студэнтаў прымалі ўдзел у дэманстрацыях, у выступленнях, у бунтах супроць таго ці іншага грамадскага парадку, супроць закону! Хіба можна зваць іх злачынцамі? Паводка ўваходзіла ў берагі, і бунтары канчалі ўніверсітэты, паступалі на дзяржаўную службу, рабіліся стараннымі чыноўнікам і дзеячамі ў розных галінах жыцця. Яны былі адданымі суддзямі, таленавітымі следчымі і пракурорамі, асабліва ў палітычных справах».

Завельмі шмат цытую Якуба Коласа? Толькі як абысціся без гэтага, калі ўжо прыведзенага эпізоду дастаткова, каб упэўніцца, што заўсёды з любой прафесіі былі людзі сумленныя, прасякнутыя жаданнем дапамагаць іншым. Нават тады, калі з-за гэтага для самога могуць быць непрыемнасці. Не пра сябе думаюць такія людзі. Галоўнае для іх, каб не была страчана вера ў праўду і справядлівасць. Такі і Петруневіч, які на судзе гарой стаяў за Лабановіча і яго паплечнікаў.

Агульнавядома, што вобраз галоўнага героя трылогіі Андрэя Лабановіча Якуб Колас у многім спісаў з самога сябе. Аднак і Казімір Петруневіч таксама меў прататып. Хоць пра гэта здагадваюцца нямногія. А стаў ім адвакат Канстанціна Міхайлавіча на згаданым працэсе — Казімір Петрусевіч. Сімпатызуючы яму, народны пясняр у ягоным прозвішчы змяніў толькі адну літару. А імя і імя па бацьку пакінуў без змен. Гэта быў Казімір Адамавіч Петрусевіч.

Нарадзіўся ён 4 сакавіка 1872 года ў фальварку Новіны, што знаходзіўся каля вёскі Душава цяперашняга Капыльскага раёна, у сям'і ляснічага Адама Петрусевіча і яго жонкі Эміліі, у дзявоцтве Стацкевіч. Апроч Адама, у сям'і выхоўваліся браты Станіслаў і Алесь. Скончыўшы Слуцкую гімназію, спрабаваў паступіць у Пецярбургскі ўніверсітэт. Але з гэтага нічога не атрымалася. Тады падаў дакументы на юрыдычны факультэт Імператарскага ўніверсітэта імя святога Уладзіміра, што знаходзіўся ў Кіеве. Відаць, юрыдычную прафесію выбраў па падказцы памешчыка Яна Наркевіча-Ёдкі, у якога яго бацька і працаваў лесніком.

З сям'ёй Наркевіча-Ёдкі ў Петрусевічаў склаліся прыязныя стасункі. На карысць гэтага сведчыць тое, што за жонку ўзяў яго дачку Яніну. На гэты час ужо быў чалавекам перадавых поглядаў. Гэтаму паспрыяла вучоба ў Кіеве. Універсітэт імя святога Уладзіміра па прагрэсіўнасці поглядаў студэнтаў і некаторых найбольш рэвалюцыйна настроеных выкладчыкаў апярэджваў іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы Расіі. Дзевятнаццагадовы Петрусевіч хутка зблізіўся з тымі, хто быў незадаволены становішчам у краіне.

Знаёмства з марксісцкай літаратурай паспрыяла выпрацоўцы ў яго перадавога светапогляду. Яго паплечнікамі былі Анатоль Луначарскі, Сяргей Мяржынскі, Пётр Румянцаў, Майсей Урыцкі і іншыя. Разам з імі наведваў тайныя сходы, канспіратыўныя гурткі, вывучаў нелегальную літаратуру. Праз некаторы час з Вацлавам Багуцкім, пазней вядомым партыйным і дзяржаўным дзеячам, узначаліў сацыял-дэмакратычную групу. Звычайна збіраліся на кватэры Багуцкага, сям'я якога падзяляла погляды студэнтаў. Плённы ўплыў на Петрусевіча аказала знаёмства з Сяргеем Мянжынскім, у будучыні адным з першых марксістаў Беларусі. Сяргей і Леся Украінка ўзаемна пакахаюць адно аднаго. Аднадумцу Петрусевіч знайшоў і ў асобе Мікалая Вігдорчыка.

Фота з сайта kopyl.by

Казімір Петрусевіч з жонкай Янінай.

Сябры задумваліся над тым, як ад звычайных сходак перайсці да больш арганізаванай рэвалюцыйнай барацьбы. Неўзабаве яны сталі першымі членамі кіеўскага «Саюза барацьбы». Пасля заканчэння ўніверсітэта Казімір Петрусевіч, працуючы памочнікам прысяжнага паверанага, сувязей з сацыял-дэмакратамі не губляў, распаўсюджваў у рабочых кварталах нелегальную літаратуру. Яніна Янаўна таксама звязала сябе з рэвалюцыйнай барацьбой. Аднак пад восень 1897 года яны былі вымушаны пакінуць Кіеў. Спачатку іх арыштавалі на пяць месяцаў, а потым выслалі ў Екацярынаслаў.

Развітанне з Кіевам перажывалася цяжка. Усё ж у гэтым горадзе прайшлі найлепшыя гады маладосці, засталося нямала сяброў. Аднак, як Петрусевічы хутка пераканаліся, Екацярынаслаў, хоць і знаходзіўся далекавата ад цэнтра, выглядаў зусім не ціхім населеным пунктам. Тут таксама віравала рэвалюцыйнае жыццё, існавала некалькі марксісцкіх груп і гурткоў.

На Дняпроўскім заводзе ў сяле Каменскім (цяпер гэта горад Дніпро на Украіне) Казімір Петрусевіч стварыў рабочы гурток. Пра гэта даведаўся піцерскі рабочы Іван Бабушкін, які таксама знаходзіўся ў высылцы. Ён наладзіў з Казімірам Адамавічам сувязь. У Екацярынаславе працавалі і шэраг іншых марксісцкіх гурткоў. З іх быў створаны екацярынаслаўскі «Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа». Калі ўзнікла пытанне, каго паслаць на будучы I з'езд Расійскай сацыял-дэмакратычнай партыі (РСДРП), які, як вядома, праходзіў у Мінску ў 1898 годзе, спыніліся на кандыдатуры Казіміра Петрусевіча.

Рэвалюцыйныя ідэі зрабілі яго пераканым праціўнікам самадзяржаўя. Нішто ўжо не магло змяніць яго поглядаў. Пераехаўшы ў 1905 годзе ў Мінск, па-ранейшаму цікавіўся марксісцкай літаратурай, падтрымліваў сувязь з рэвалюцыянерамі. Калі ж напярэдадні прыняцця вядомага царскага маніфеста ад 17 кастрычніка 1905 года арганізоўвалася ўсеагульная забастоўка, пайшоў да паштовых і чыгуначных рабочых, заклікаючы іх прыняць удзел у гэтым важным палітычным мерапрыемстве. Забастоўка, на жаль, скончылася Курлоўскім расстрэлам.

Яна каштавала каля 100 жыццяў. Не адна сотня была ранена, многія трапілі ў засценкі. Такі лёс напаткаў і Казіміра Адамавіча. У турме правёў некалькі месяцаў. А вызваліў яго сам Курлоў, які і арганізаваў бойню. Гэта, безумоўна, сведчыць не аб дабраце мінскага губернатара. Казімір Петрусевіч быў чалавекам, які знаходзіў паразуменне і з тымі, хто прытрымліваўся іншых поглядаў. Гэта відаць з успамінаў палітычнага і грамадскага дзеяча Эдварда Вайніловіча: «Я помню, быў пасаджаны ў турму мясцовы адвакат К. Петрусевіч, у якога былі левыя перакананні. Да мяне прыйшлі яго калегі з адвакатуры з просьбай пахадайнічаць за яго перад Курловым. Я запатрабаваў ад іх абяцанне, што іх асуджаны калега не будзе больш весці ніякай антыўрадавай прапаганды, і накіраваўся да Курлова. Пасля таго, як я заявіў, што бяру Петрусевіча на парукі, Курлоў тут жа па тэлефоне загадаў яго вызваліць».

Узначаліўшы мінскую гарадскую групу грамадскіх абаронцаў, Казімір Адамавіч па магчымасці аказваў дапамогу тым, каго ўлады праследавалі. Пра яго як рэвалюцыйна настроенага адваката ведаў і малады настаўнік Канстанцін Міцкевіч. Калі за ўдзел у настаўніцкім з'ездзе будучага народнага песняра абвінавацілі ў антыўрадавай дзейнасці, ён 2 ліпеня 1908 года звярнуўся ў Віленскую судовую палату з прашэннем, каб абаронцам яго на будучым судовым працэсе быў Казімір Петрусевіч.

Пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі Казіміра Адамавіча выбралі старшынёй сходу польскіх рабочых Мінска. Ён выступіў ініцыятарам спецыяльнага пасланя ў падтрымку бальшавікоў. За яго подпісам гэты дакумент накіравалі ў Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Апынуўшыся пазней у Заходняй Беларусі, таксама не здрадзіў рэвалюцыйным ідэям. Яго голас гучаў на многіх судовых працэсах. Прафесар кафедры грамадзянскага права Віленскага ўніверсітэта Казімір Петрусевіч, як і раней, абараняў інтарэсы тых, хто змагаўся за свабоду.

Шырокі рэзананс не толькі ў Польшчы, але і далёка за яе межамі меў судовы працэс над членамі Беларускай сялянска-рабочай грамады — Браніславам Тарашкевічам, Сымонам Рак-Міхайлоўскім, Пятром Мятлой і іншымі, што пачаўся 23 лютага 1928 года. Сярод адвакатаў Казімір Адамавіч быў найбольш рэвалюцыйна настроеным. Ён абараняў не толькі членаў грамады, але і, па сутнасці, ідэалы сваёй маладосці. Гэты працэс дорага каштаваў яму. Яго выгналі з універсітэта. Але ніхто і ніколі не мог прымусіць Казіміра Петрусевіча пайсці на кампраміс з уласным сумленнем, адмовіцца ад сваіх поглядаў.

Наступіў 1934 год... За рэвалюцыйную дзейнасць арыштавалі Максіма Танка. Казімір Адамавіч ужо ведаў творы маладога на той час паэта. Яны публікаваліся ў заходнебеларускім друку, у тым ліку і ў нелегальных выданнях. Імпанавала яму і рэвалюцыйная дзейнасць Яўгена Скурко. Таму і ўзяў на сябе абарону паэта-рэвалюцыянера. Максім Танк успамінаў: «На апеляцыйным судзе мяне абараняў вядомы віленскі адвакат К. Петрусевіч, адзін з удзельнікаў I з'езда РСДРП. Помню, як ён упершыню прыйшоў да мяне ў Лукішкі. "Мне ўжо даводзілася абараняць беларускіх пісьменнікаў", — сказаў ён, паздароўкаўшыся са мной. Гэта быў тыповы прадстаўнік таго пакалення старой віленскай інтэлігенцыі, якая праяўляла спачуванне да нацыянальных меншасцяў і знаходзілася ў апазіцыі да паланафільскай палітыкі санацыі».

Пасля Другой сусветнай вайны Казімір Адамавіч жыў у Польшчы. Быў дарадцам у рэпарацыйных установах Польскай Народнай Рэспублікі, суддзёй Вярхоўнага суда ПНР, членам Галоўнага адвакацкага савета. Урад узнагародзіў яго ордэнам «Адроджаная Польшча». Напісаў шэраг прац па грамадзянскім праве. Памёр 14 жніўня 1949 года.

Годна жыў і яго сын, таксама Казімір, удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. У Другую сусветную вайну змагаўся ў спецатрадзе Народнага камісарыята дзяржаўнай бяспекі СССР. Схоплены фашыстамі, быў прыгавораны да расстрэлу, але ўцёк. Пасля вайны працаваў намеснікам міністра харчовага забеспячэння, марскога гандлёвага флоту ПНР, загадчыкам аддзела навукі і ВНУ Цэнтральнага камітэта Польскай аб'яднанай рабочай партыі. Стаяў каля вытокаў Інстытута экалогіі Акадэміі навук Польшчы і быў яго дырэктарам.

Сяргей НЕСЦЯРЭНКА

Сузіральнік і лірык Леў Лейтман

Нацыянальны мастацкі музей з тых устаноў, якія радуюць гледача не толькі надзвычай цікавымі, але, калі так можна сказаць, невідавочнымі і нечаканымі выстаўкамі. Здавалася б, наколькі заўважна ў мастацкім календары такая дата, як 125 гадоў з дня нараджэння… Аднак, напэўна, тут не столькі імкненне супрацоўнікаў выконваць пэўныя планы выставачнай дзейнасці, колькі жаданне звярнуць увагу на творчасць прызнаных майстроў, імёны якіх згадваюцца ўсё радзей. Сярод такіх — імя Льва Лейтмана (1896—1974), якому сёлета споўнілася 125 гадоў. Экспазіцыя ў НММ мае магчымасць стаць адным з самых прадстаўнічых паказаў яго работ. Якім паўстае савецкі мастак перад сучасным гледачом?

Спявак горада. Праект Нацыянальнага мастацкага ахапіў усе перыяды творчага жыцця майстра, пачынаючы з карцін віцебскага перыяду 1930-х гадоў і заканчваючы работамі, створанымі ў апошні год жыцця. Адна з ключавых тэм Льва Лейтмана (і гэта відаць па дадзенай выстаўцы) — гарадскі пейзаж. Дарэчы, пра дзяцінства і перадумовы творчага лёсу будучага мастака амаль нічога не вядома. Застаецца толькі згадаць дзве важныя падзеі ў жыцці Льва Лейтмана — навучанне ў Юлія Бяршадскага ў Адэсе і Юдэля Пэна ў Віцебску (пазней скончыў курсы па павышэнні кваліфікацыі мастакоў пры Усерасійскай акадэміі мастацтваў у Ленінградзе прафесара Сямёна Абугава). Лічыцца, што менавіта падчас пленэраў у наваколлі Віцебска хлопец захапіўся пейзажам.

Сярод найбольш вядомых работ у гэтым кірунку — «Вуліца Леніна» (1970), «Паркавая магістраль» (1969), «Вяснаўпарку» (1967), «Агні Мінска» (1959), «Калятаполі Янкі Купалы» (1957), «Восень. Цэнтральная плошча» (1966), «З акна майстэрні» (1966)… Як асобнае прысвячэнне сталіцы — работы серыі «Новыя абрысы гарадоў Беларусі (Новы Мінск)», прадстаўленыя ў экспазіцыі. Створаныя ў перыяд інтэнсіўнага горадабудаўніцтва «Праспект імя І. В. Сталіна» (1952), «Галоўны паштамт» (1954), «Галоўны ўваход на стадыён “Дынама”» (1952) вылучаюцца светлымі колерамі і мяккімі пераходамі. Аўтар не толькі паказаў прыгажосць Мінска з яго плошчамі, магістралямі, архітэктурнымі ансамблямі, праспектамі, бульварамі, але і перадаў спакой мірнага жыцця, надзеі на светлае і радаснае герояў — звычайных жыхароў, якія ідуць на працу, прагульваюцца з сябрамі, чакаюць на прыпынку.

Горад Віцебск глядач можа ўбачыць на карціне «Дажджлівы дзень (Дзвіна. Віцебск)» 1934 года, здаецца, самай ранняй з прадстаўленых на выстаўцы. Тут угадваецца стыль, якому Леў Лейтман ніколі не здрадзіць, нягледзячы на эксперыменты з фактурай паперы, змешваннем гуашавых і акварэльных асноў, — вялікая ўвага да паказу неба, уменне перадаць стан прыроды і яе гармонію з горадам, а таксама адмаўленне ад выразнага дзеяння і прыкметных персанажаў.

«Мінскае возера», 1952 г.

У гэтым бачыцца жыццесцвярджальнасць і прага ўсяго сонечнага, хоць уласна самога сонца на карцінах аўтара, прынамсі тых, што знаходзяцца ў экспазіцыі, няма.

Прыродалюб. Леў Лейтман праявіў свой талент у розных тэхніках: туш, соус, італьянскі аловак, сангіна, сепія, манатыпія, фламастар і алей, але асабліва віртуозна ім выкананы творы ў тэхніцы акварэлі і гуашы. З іх дапамогай мастак адлюстроўваў і спакой воднай роўнядзі, і яркі заход сонца, і цяпло восеньскай прыроды. На выстаўцы ж у Мастацкім сярод светлых пейзажаў вылучаецца «Зімовая ноч» (1971) — завяршальная работа экспазіцыі. Кантрасная і гарманічная, яна пераносіць гледача ў звычайную занесеную снегам вёску пад поўняй. Сюжэт, нягледзячы на паравіну года на карціне, выпраменьвае цяпло і спакой.

Асабліва пяшчотнымі ў Льва Лейтмана атрымліваліся нацюрморты. Пры іх стварэнні мастак выкарыстоўваў у афармленні інтэр’ера вазы рознай канфігурацыі і колераваў палітры, але адценні чырвонага — нязменны складнік. Недаўгавечнае кветкавае харство Леў Лейтман перадаваў шырокімі і шчодрымі мазкамі. Як адзначае куратар выстаўкі Анастасія Карнейка, старшы навуковы супрацоўнік аддзела беларускага мастацтва XX—XXI стст., спадчына Льва Лейтмана адрозніваецца выразнасцю, сузіральнасцю, лірычнымі інтанацыямі. Мастак неаднаразова казаў, што яго творчасць фарміравалася пад уплывам найбуйнейшых майстроў рускага і французскага мастацтва. Сваімі настаўнікамі лічыў Ісаака Левітана, Міхаіла Урубеля, Клода Манэ і Эдуарда Манэ.

Сведка вайны. Заслужаны дзеяч мастацтваў, мастак-графік і педагог Леў Лейтман прайшоў Вялікую Айчынную: служыў у часцях Ваенна-будаўнічага ўпраўлення Заходняга фронту. Між тым у ваенны перыяд удзельнічаў у выстаўках твораў беларускіх мастакоў у Маскве (1941) і «Вялікая Айчынная вайна» (1942). Шмат карцін, створаных ім перад вайной, было страчана, захаваліся толькі тыя, што былі прадстаўлены ў экспазіцыі ў Маскве.

На франтавых будоўлях, у месцах нядаўніх баёў і на тэрыторыях, вызваленых Чырвонай Арміяй і яе саюзнікамі ад фашысцкіх захопнікаў, творца зрабіў шэраг накідаў і эцюдаў акварэллю, гуашшу, алоўкам. У іх адсутнічаюць батальныя сцэны: Леў Лейтман засяроджваўся на раскрыцці паўсядзённага ходу жыцця. У цэнтры ўвагі — віды ўцалелых і жылых будынкаў, абрысы разбураных і пакінутых пабудоў, простыя людзі і салдаты… Лірычныя, поўныя веры ў дабро, у экспазіцыі прадстаўлены работы «Магістраль Мінск — Масква» (1944), «Зімовы пейзаж» (1943), «Вёска Серада» (1943—1944), «У раёне Валакаламска» (1943), «Чырвоныя дахі (Калуга)» (1942—1943), «Клязьма» (1943), «Арэхава-Зуева» (1944).

Партрэтыст герояў свайго часу. Усяго ў экспазіцыі да 125-годдзя з дня нараджэння мастака экспануецца звыш 50 твораў арыгінальнай графікі са збору Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, Віцебскага абласнога краязнаўчага музея, фондаў Беларускага саюза мастакоў, а таксама творы, дакументы і фатаграфіі розных гадоў з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва. Вялікая колькасць карцін — прысвячэнне працаўнікам.

У 1930-я гг. яго захапіла індустрыяльная тэма. Як вынік — серыя работ «Жанчына на вытворчасці» (дарэчы, у гэты ж час стварыў серыю «Жыццё, быт і вучоба Чырвонай Арміі», за якую быў узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР). Пазней былі «Разведчыкі будучыні — людзі камуністычнай працы» і «Людзі калгаснай працы». Героі амаль заўсёды пададзены буйным планам, яны спакойныя і задуменныя, прамяністыя і жыццярадасныя. Як адзначаюць мастацтвазнаўцы, партрэты Льва Лейтмана

«Коўзанка», 1971 г.

сведчаць аб яго назіральнасці, выдатным разуменні чалавека і здольнасці пераканаўча гэта перадаць. Падкрэсліваючы індывідуальныя рысы героя, мастаку ўдавалася ўвасобіць вобраз сучасніка. Для аўтара гэта было надзвычай важна.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Прастора для творчага «я»

Першая персанальная выстаўка «Час пошуку» работ маладой мастачкі, ураджэнкі Барысава Дарыны Даўгадзілінай адкрылася ў мастацкай галерэі «З’ява» Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І. Х. Каладзеева.

З творчасцю Дарыны ўпершыню пазнаёмілася ў снежні мінулага года, калі ў канферэнц-зале раённай бібліятэкі дэманстравалася ўнікальная выстаўка сакральнага мастацтва «Брама веры» з фондаў музея старажытнабеларускай культуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Датаваны XIX стагоддзем абраз «Ісус Хрыстос», які знайшлі ў вёсцы Амельянец Брэсцкай вобласці, адрэстаўрыравала менавіта наша зямлячка. Потым яшчэ не раз з’яўляліся прыемныя магчымасці атрымаць асалоду ад любавання карцінамі гэтага аўтара на іншых зборных экспазіцыях. І вось зноў гучыць яе імя: выстаўка «Час пошуку» — шыкоўны падарунак барысаўчанам і гасцям рэгіёна! І, што не менш важна, прыкметная падзея ў год правядзення рэспубліканскай акцыі «Барысаў — культурная сталіца Беларусі 2021 года».

Яшчэ да адкрыцця вернісажу Дарына крыху распавяла пра сябе:

— На мае здольнасці да малявання звярнулі ўвагу бацькі. Дзякуючы ім стала вучыцца ў сярэдняй школе № 2, дзе мастацкім навукам удзяляецца вялікая ўвага, і адначасова займацца ў Барысаўскай дзіцячай мастацкай школе, дзе ўменні навучэнцаў развіваюцца больш грунтоўна. Хацелася тварыць, а таксама звязаць будучую прафесію з мастацтвам. Працягнула адукацыю ў Мінскім дзяржаўным архітэктурна-будаўнічым каледжы па спецыяльнасці «Графічны дызайн», а затым — на кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва

Фота Юліі Ільюшанкі.

Падчас адкрыцця выстаўкі.

Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Цёплыя ўспаміны захаваліся пра педагогаў Аксану Юркевіч, мужа і жонку Вікенція і Галіну Стасевічаў, Алену Бараноўскую, Віталія Герасімава, Уладзіміра Зінкевіча, Таццяну Кандраценку... Асабіста хачу адзначыць вялікі ўплыў на маё творчае станаўленне мастака Сяргея Станіслаўчыка.

Юная творца прызналася, што яе натхняюць старадаўнія рэчы, эмоцыі людзей, прырода — спектр ідэй абсалютна шырокі! Яна піша карціны і паралельна займаецца рэстаўрацыяй. Першае, на яе погляд, вельмі складана, таму што здараюцца выпадкі, калі пачаты твор можна не завяршыць зусім ці вярнуцца да яго пазней. А вось рэстаўрыраваць абразы, лічыць дзяўчына, можа навучыцца любы мастак.

Дарына любіць творчасць Гальбейна, Караваджа, Макоўскага, Рэпіна, Трапініна, Заборава. Імкненне да высокага мастацтва падштурхоўвае вышэй уздымаць асабістую планку. Мяркуйце самі: у 2019-м у намінацыі «Найлепшая кампазіцыя» на мастацкім факультэце БДАМ Дарына атрымала дыплом I ступені і стала лаўрэатам I Рэспубліканскага конкурсу «Трыенале маладых мастакоў» у намінацыі «Сімпатыя гледачоў».

Наступны год адзначыўся дыпломам III ступені ў адной з намінацый конкурсу найлепшых работ на мастацкім факультэце Акадэміі мастацтваў. Дарына актыўна ўдзельнічае ў рэспубліканскіх і міжнародных выстаўках, два гады стажыравалася як рэстаўратар у Варшаўскай акадэміі прыгожых мастацтваў.

І гэта не ўсе дасягненні! Цяпер дзяўчына рыхтуецца да ўступлення ў Беларускі саюз мастакоў і плануе прэзентаваць персанальную выстаўку ў Мінску. Ёсць упэўненасць, што планы здзейсняцца. Пацвярджэнне таму — выстаўка «Час пошуку».

— Адкрываць першую выстаўку для работнікаў бібліятэкі гэтак жа адказна, як і аўтару рыхтаваць свае работы да экспазіцыі, — зазначыла дырэктар Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І. Х. Каладзеева Алена Капыток. — Наша кніжніца заўсёды рада прадстаўляць новыя імёны, а імёны барысаўчан — асабліва. «Час пошуку» — выстаўка незвычайная, яе складаюць нацюрморты, пейзажы, партрэты, іканапісныя работы і копіі карцін вядомых майстроў свету.

Дарына Даўгадзіліна эксперыментуе з рознымі тэмамі і жанрамі, пераасэнсоўвае навакольны свет, аналізуе паняцце «прыгажосць» і тым самым працягвае лепшыя традыцыі беларускай рэалістычнай школы жывапісу.

Алена БРЫЦКАЯ

«Нясвіжская фартэцыя», або Назад у мінулае

Складана знайсці чалавека, які б не ведаў пра род Радзівілаў. Яшчэ складаней знайсці тых, хто не чуў пра рэзідэнцыю знакамітай дынастыі — Нясвіжскі замак. Менавіта тут 14—15 жніўня ўпершыню прайшоў фестываль гістарычнай рэканструкцыі, культуры і музыкі XVII—XVIII стагоддзяў і эпохі Сярэднявечча «Нясвіжская фартэцыя».

Баль у двары Нясвіжскага замка.

Горад майстроў

Першымі на фестывалі пачалі працаваць рамесныя рады. Сыраварства, разьба па дрэве, вышыўка… Усяго было арганізавана больш за 15 відаў розных рамесных майстэрняў. Кожны жадаючы мог падысці і паспрабаваць сябе ў любым відзе рамесніцтва, стаць ганчаром або кавалём ці купіць ужо гатовы выраб, каб не вяртацца дадому без сувеніра. Здавалася б, многае з прапанаванага выйшла з моды, як, напрыклад, пляценне лапцей або ткацтва на старадаўніх станках. Але ўсё гэта выклікала такую шчырую цікавасць, што збіраліся цэлыя чэргі.

Побач з рамеснымі радамі таксама адбываліся цікавыя дзеі. Найперш выклікалі велізарнае захапленне ў людзей усіх узростаў вогненныя шоу. У пэўныя моманты станавілася страшна за артыста, які па-майстэрску абыходзіўся з агнём. Нельга не адзначыць намаганні блазнаў, якія адмыслова выконвалі сваю функцыю — забаўляць і не сумаваць. Стаміўся ў майстэрні? Блазны дапамогуць адпачыць.

Ваяры і бітвы

Воіны рэгулярнай арміі, шляхта Бабруйскага павета, шатландскія войскі, крылатыя гусары і не толькі крочылі па Англійскім парку ва ўрачыстым парадзе, які прайшоў ад пачатку парку і аж да сцэны, дзе адбывалася далейшая дзея.

У парадзе прымалі ўдзел аматары ў рэканструяваных касцюмах воінаў розных эпох (Сярэднявечча, XVII—XVIII стст., а таксама XIX стагоддзя). Усё было зроблена з незвычайнай дакладнасцю. Прапрацавалі самыя дробныя дэталі. Рэканструктары адказна падышлі да сваёй справы. Акрамя ваяроў, удзел у парадзе прымала і світа. Дзяўчыны ў прыгожых, вытанчаных сукенках з шыкоўнымі веерамі прыцягвалі ўвагу ўсіх, вылучаючыся на фоне асаністых мужчын у даспехах і форме.

Крыху пазней, у 12:20 на рысталішча (месца правядзенне конных і іншых спаборніцтваў) выйшлі воіны. Першымі на «сцэне» з'явілася шляхта Бабруйскага павета і рэгулярнае войска. У думках многіх гледачоў паўстала цалкам апраўданае пытанне: пры чым тут воіны, калі шляхта — гэта дваранства ВКЛ, а потым і Рэчы Паспалітай? На пытанне далі адказ самі рэканструктары. Шляхта першапачаткова была выключна вайсковым саслоўем і толькі з часам здолела зацвердзіць права на выбарную манархію. У часы войнаў шляхта ператваралася ў дваранскае апалчэнне. Перад паказальнымі выступленнямі падраздзяленняў удзельнікі рэканструкцыі паказалі і расказалі аб усіх элементах абмундзіравання воінаў. Рэгулярным войскам былі прадэманстраваны атакуючыя і абарончыя пастраенні. Усё адбывалася пад гучныя загады галоўнакамандуючага.

Нясвіжскі замак. Сталовая зала.

Далей на рысталішча выйшлі шатландскія наёмныя ваяры. Для многіх стала навіной тое, што ў свой час шатландскія наймiты жылі на тэрыторыі Беларусі. Па словах рэканструктараў, колькасць перасяленцаў налічвала больш за 30 тысяч. Самым вялікім месцам іх рассялення быў горад Слуцк. Шатландцаў ахвотна наймалі ў войска. Каб паказаць, наколькі пяхотнікі па-майстэрску валодалі баявымі навыкамі, арганізатарамі фестывалю была адноўлена бітва пад Алькенікамі, якая адбылася 18 лістапада 1700 года ў часы грамадзянскай вайны ў Вялікім Княстве Літоўскім. Праціўнікамі ў рэканструяванай бітве былі шатландскія наёмныя войскі, якія выступалі на баку ВКЛ, і шляхта Бабруйскага павета, якая выступала на баку Сапегаў.

Пасля шатландская пяхота, застаўшыся на рысталішчы, прадэманстравала ўменне вядзення бою. Былі паказаны баявыя пастраенні, валоданне рознымі відамі зброі, пачынаючы з шаблі і мяча і заканчваючы дзідамі і пісталетамі. Не забылі і пра побыт і культуру шатландскіх воінаў. Звычаі, забавы, музыка і танцы — усё было паказана так, што ўзнікала пачуццё, быццам ты сапраўды перанёсся ў далёкае мінулае.

Не забывалі рэканструктары і пра гледачоў. Напрыклад, паміж двума наведвальнікамі фестывалю было арганізавана спаборніцтва, сутнасць якога — рознымі відамі зброі трапіць у кольца. Змянялася зброя — мяняўся дыяметр кальца на больш вузкі.

Не магла не крануць гледачоў сумная гісторыя каханых, якія не змаглі быць разам. Шатландскага воіна загадаў забіць пакрыўджаны жаніх. На апошнім дыханні пехацінец дабраўся да сваёй любай і аддаў на развітанне кулон з просьбай захаваць яго. У якасці сваёй каханай шатландскі пехацінец абраў дзяўчыну з наведвальніц фестывалю.

Пасля на рысталішчы прайшоў турнір па шабельным баі. Воіны змагаліся адзін супраць аднаго. І пераможцам станавіўся не той, хто паваліць праціўніка, а той, хто больш спадабаецца гледачу.

Падчас турніру.

У 15:40 пачаўся сярэднявечны блок. Арганізатары расказвалі аб тактыцы бою і ўзбраенні салдат. Уразілі гледачоў пешыя і конныя рыцарскія турніры. Апошні пачаўся з дэманстрацыі майстэрства на трэнажорах. Напрыклад, на скаку трэба было трапіць дзідай у кольца. Іншае заданне заключалася ў тым, што рыцару было неабходна па чарзе рассячы муляжы сапернікаў у выглядзе капусты, якая знаходзілася па абодва бакі ад рук ваяра, чым ускладнялася задача. Толькі пасля праходжання трэнажорных выпрабаванняў рыцары прыступілі да баёў адзін з адным. Пасля коннага турніру адбылося спаборніцтва лучнікаў.

У 18:30 наведвальнікаў фестывалю перанеслі ў эпоху 1812 года. Былі праведзены паказальныя выступленні, прадэманстраваны ваенныя тактыкі і манеўры. Менавіта перыядам напалеонаўскіх войнаў скончыўся ваенны блок фестывалю.

Між тым недалёка ад рысталішча размясціўся ваенны лагер, у якім атабарыліся воіны. Усё было прадумана да дробязяў: пачынаючы ад таго, як стаяць палаткі і заканчваючы тым, як разводзіцца вогнішча. Усе наведвальнікі маглі прайсці ў лагер, паназіраць за салдацкай жыццём «у полі». Акрамя таго, можна было паесці салдацкай ежы, сфатаграфавацца са зброяй.

Баль у Радзівілаў

Радзівілы — найбагацейшы і найзнакаміцейшы род на тэрыторыі Беларусі, вядомы прыгодамі і легендамі. Не ў апошнюю чаргу ён знакаміты сваімі пышнымі і яркімі балямі. Таму нядзіўна, што баль у Радзівілаў адбыўся і на фестывалі гістарычнай рэканструкцыі «Нясвіжская фартэцыя». Ён быў дадзены ў двары Нясвіжскага замка ў 17:00. Гаспадары, выступіўшы з прывітальным словам, сустракалі гасцей з розных частак Беларусі. Усе былі апрануты ў касцюмы радзівілаўскай эпохі. Праз стагоддзі баль захаваў свае правілы і звычаі, у тым ліку паслядоўнасць танцаў. Першым быў «Паланэз», які ў выкананні больш за сотні пар глядзеўся надзвычай маляўніча.

Атмасфера, якая панавала вакол, дазволіла адчуць сябе нібыта ў казцы. Выдатныя касцюмы, прыгожая архітэктура замка, жывая музыка — усё гэта выклікала пачуццё нерэальнасці таго, што адбываецца. Не было адчужанасці і пачуцця, што глядзіш на баль, знаходзячыся ў XXI стагоддзі. Разам з удзельнікамі наведвальнікі перанеслі на стагоддзі таму.

Гучала музыка...

На працягу ўсяго фестывалю, у перапынках паміж бітвамі гучала музыка выканаўцаў сярэднявечных песень розных часавых адрэзкаў. Таксама ў завяршэнні першага дня фестывалю выступалі некаторыя музычныя групы і творчыя калектывы з розных куткоў Беларусі.

Перад пачаткам баявых дзеянняў на рысталішчы на сцэну выйшла група «Хмельны Вір», якая сваёй энергіяй заразіла ўсіх слухачоў. Музыкі не проста выконвалі сярэднявечную музыку, але і распавядалі аб інструментах, на якіх яны іграли.

«*NEVRIDA*» — яшчэ адна музычная група. У рэпертуары калектыву песні на розных мовах: беларускай, рускай, англійскай і башкірскай. Стыль — «лютая эклектыка».

«*Cool Kids*» — гэта першая і адзіная ў Віцебску студыя навучання работы з рэквізітам *flow art* і светлавым рэквізітам для дарослых і дзяцей. Неверагодную энергію калектыву можна было адчуць у поўнай меры.

14 жніўня фестываль быў завершаны выступленнем каманды «*KETRI*». Гэта этнатэатр танца, музыкі і агню. У іх стылі — этнапластыцы — спалучаюцца розныя культуры: афра, усход, шаманскія і славянскія традыцыі і многае іншае.

* * *

Другі дзень фестывалю быў насычаны сярэднявечнымі тактычнымі бугуртамі (рыцарскія турніры, падчас якіх змагаліся дзве групы рыцараў, узброеныя затупленай зброяй) і сярэднявечнымі тактычнымі гульнямі, паказальнымі выступленнямі воінаў XVII—XVIII стагоддзяў і шатландскай пяхоты... Усяго не пералічыць!

Алеся ЧАЧУРА,
студэнтка журфака БДУ
Фота аўтара

Плёнка не церпіць недакладнасцей

У экспазіцыйнай зале Музея гісторыі беларускага кіно адкрылася персанальная выстаўка дасведчанага мастака-дэкаратара і мастака-пастаноўшчыка Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Івана Рагаценя «50 гадоў у кіно». Адкрыццё экспазіцыі прыпала акурат на 75-гадовы юбілей кінематаграфіста. Увазе наведвальнікаў — матэрыялы творчай лабараторыі мастака: чарцяжы, эскізы, запісы, прылады працы і іншыя цікавыя артэфакты, якія дазваляюць зазірнуць за кінаэкран і рассунуць межы знакамітых кадраў.

Вытокі творчасці

Іван Рагацень, паступіўшы на архітэктурны факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута, першапачаткова планаваў звязаць сваё жыццё з дойлідствам, але праз шэраг акалічнасцей апынуўся ў кіно. Як расказаў сам мэтр у нядаўнім інтэрв'ю, яго аднакурснікам быў родны брат славутага кінааператара Юрыя Марухіна — Вячаслаў. Ён і пазнаёміў Івана са сталічнай кінасуполкай. Калі аднойчы маладому чалавеку спатрэбілася ўзяць акадэмічны адпачынак, Вячаслаў прапанаваў яму падпрацоўку на студыі на гэты час. Так Іван Рагацень трапіў на здымачную пляцоўку, дзе і правёў наступныя 50 гадоў.

Першым вопытам у кіно стала асісціраванне мастаку ў 1968 годзе на здымках дзіцячага фільма «Мы з Вулканам» (рэж. Валянцін Пяроў). Некаторыя эпізоды карціны адбываліся на будаўнічай пляцоўцы, і маладому спецыялісту нават даверылі зрабіць адну дэкарацыю — звычайную бытоўку з навесам, прызначаным для гульні ў даміно. Навыкі архітэктара аказаліся тут вельмі дарэчы. Як успамінае Іван Аляксандравіч, ён дужа хваляваўся, але заданне ўсё ж выканаў добра. Уласна, з такога няхітрага практыкавання і пачаўся доўгі шлях у кінематографе творцы, сёння аднаго з самых заслужаных і запатрабаваных.

Наступным праектам у партфоліа стала работа (ужо ў якасці мастака-дэкаратара) над фільмам «Я, Францыск Скарына» (1969 год). Гэтым разам калегі па здымачнай пляцоўцы падабраліся масцітыя: рэжысёрам баёпіка выступіў Барыс Сцяпанаў, а ў галоўнай ролі зняўся Алег Янкоўскі. Дэкаратару было даручана ўзнавіць двор Ягелонскага ўніверсітэта. Задача для пачаткоўца, мякка кажучы, няпростая і да таго ж вельмі адказная, але ўсё атрымалася. Дарэчы, на выстаўцы ёсць цікавы эскіз друкарскага станка Францыска Скарыны, адноўленага для здымак у дакладнай адпаведнасці з рэальным прататыпам.

Мастацкія выклікі

Па-сапраўднаму вялікая праца пачалася з фільма «Магіла льва» (рэж. Валерый Рубінчык, 1971 год). Стужка, знятая па матывах паэмы Янкі Купалы, якая ў сваю чаргу заснавана на народных паданнях беларусаў, вычарпальна прадэманстравала ўвесь маштаб таленту маладога аўтара. І мы не памыляемся, ужываючы гэтае слова! Трэба быць сапраўдным аўтарам, мець сваё бачанне і нават пэўную дзёрзкасць, каб зладзіць штосьці падобнае. З усіх прыкладаў, экспанаваных на выстаўцы, мастацкае рашэнне гэтага фільма ўражвае найбольш. Невыпадкова менавіта дадзеная работа абрана ў якасці пункту адліку.



Кадр з фільма «Магіла льва», 1971 г.

Чарцяжы і эскізы нярэдка суседнічаюць на стэндах з кадрамі гатовых фільмаў, каб можна было параўнаць першапачатковую задуму і яе рэалізацыю. Але больш цікава паглядзець зманціраваны фрагмент карціны, у якім фігуруюць самыя прыкметныя мастакоўскія прыдумкі. Арганізатары пакінулі наведвальнікам і такую магчымасць, размясціўшы ў цэнтры экспазіцыі тэлеманітор. Ён бесперапынна трансліруе падборку з розных, найбольш заўважных работ кінамастака. Апроч іншых, паказаны і асобныя эпізоды з «Магілы льва». Паверце, вам не хопіць часу, каб удосталь нацешыцца тымі дэкарацыямі.

Праца была праробліва каласальная. Інтэр'еры замка Усяслава ў кульмінацыйны момант «траянскага» пранікнення туды мсціўца Машэкі нагадваюць адначасова і вобразы дахрысціянскай архітэктуры з першабытнай энергетыкай, і скажоныя дэкарацыі фільмаў нямецкага кінаэкспрэсіянізму 1920-х. Непрактычнасць, нерэалістычнасць і нават некаторая перакручанасць прасторы добра суадносяцца з характарам сцэны, а змрочнасць памяшканняў яшчэ мацней згушчае атмасферу. У спалучэнні з жудаснай музыкай, рытмічным мантажом і выверанай харэаграфіяй, а таксама неверагоднымі касцюмамі і грымам, якія да прагляду і ўявіць было б складана, дэкарацыі робяць гэтую сцэну амаль што ўзорным кінавідовішчам.

Фота з сайта sb.by

Іван Рагацень.

Акрамя фільмаў, заснаваных на міфалогіі, ды гістарычных карцін у сярэднявечным антуражы, у скарбонцы мастака, само сабой, шмат стужак і на тэму Вялікай Айчыннай. Корпус ваеннага кіно, як вядома, складае важную частку ўсяго беларускага кінематографа. Івану Рагаценю давялося папрацаваць на гэтай ніве з многімі буйнымі рэжысёрамі: з Віталем Чацверыковым над «Полымем» (1974), з Валерыем Рубінчыкам над «Вянком санетаў» (1976), з Міхаілам Пташуком над карцінай «У жніўні 44-га» (2001). Дзеля сіметрычнасці дадамо сюды яшчэ Міхаіла Сегала з яго фільмам «Франц + Паліна» (2006).

Гордасцю Нацыянальнай кінастудыі і самога кінамастака, сапраўдным здабыткам айчыннага кіно з'яўляецца мастацкае рашэнне «Вянка санетаў». Вельмі ганарыцца дэкаратар і работай над фільмам «Полымя», на здымках якога ўзводзілі цэлую невялікую вёску (каб потым яе спаліць). Галоўнымі эпітэтамі для апісання прафесійнага падыходу творцы маглі б стаць «скрупулёзны» і «карпатлівы», бо нават пры стварэнні вёскі, якая завочна была асуджана на гібель, мастак праявіў незвычайную ўпартасць у дасягненні натуральнасці. Проста, па назіранні майстра, плёнка не церпіць недакладнасцей…

Кадр з серыяла «Вольф Месінг: той, хто бачыў скрозь час», 2010 г.

Прафесія ў дэталях

Найбольшую цікавасць на выстаўцы ўяўляюць арыгінальныя чарцяжы і эскізы Івана Рагаценя. Многія з іх змяшчаюць кароткія (а дзе і не зусім) нататкі, якія праліваюць святло на некаторыя асаблівасці працы дэкаратара і мастака-пастаноўшчыка. Па-першае, як высвятляецца, такая прафесія патрабуе ад чалавека ўніверсальнасці ведаў і вялікай эрудыцыі. Мастак-пастаноўшчык, мяркуючы па экспазіцыі, — той, хто разбіраецца (хаця б павярхоўна) ва ўсіх гістарычных эпохах і мастацкіх стылях, у армейскай амуніцыі і сельскагаспадарчых прыладах, у высокай модзе і нават у караблебудаўніцтве.

Цікава чытаць падобныя тэхнічныя заўвагі побач з малюнкамі: «На плыце ўстанавіць дзве армейскія ручныя лябёдкі з тросамі 250 м» або «Чарназём 4—10 см; штучныя галінкі прывязаць да тонкіх прутоў; таматы прывязаць» і інш. Апошні запіс датычыцца стварэння дэкарацыі цяпліцы для расійскага серыяла «Ажаніць мільянера» (2010). Уражанне ўзмацняюць вітрыны з мастакоўскімі прыладамі, якія наўмысна раскладзены так, каб імітаваць творчы беспарадак. Сярод абавязковых інструментаў кінамастака — пэндзлі, ручкі, фламастары, вядома ж, алоўкі. Да іх дадаюцца скотч, рулетка, цыркуль, нажніцы і інш.

Дзеля справядлівасці трэба зазначыць: фармат экспазіцыі, шчыра кажучы, мог быць больш разгорнутым. Тым не менш наведаць яе мае сэнс, асабліва калі вы цікавіцеся прафесіяй кінамастака. Ды і іншай магчымасці паразглядваць арыгінальныя малюнкі вядомага майстра, парасчытваць цікавыя пазнакі на палях можа не прадставіцца. Музейшчыкі зманціравалі займальную падборку кінафрагментаў.

Мікіта ШЧАРБАКОЎ

Юбілеі як штуршок да адкрыццяў

З вялікай цікавасцю гартаю рэгіянальныя, раённыя газеты. Яны заўсёды прыносяць нейкую падказку. Мясцовыя журналісты бачаць жыццё непасрэдна, зблізку. Даволі часта робяць сапраўдныя адкрыцці, якія пасля становяцца і асновай гістарычнага, больш важнага даследавання, пошуку, скіраванага на грунтоўнае выкладанне той ці іншай тэмы.

Але часам і раённы друк абмінае штосьці з таго, што ўзвышае пэўную старонку. Каб гэтага не здарылася, у «Пухавіцкіх навінах» многія гады друкуецца вельмі насычаная газетная палоска з календаром памятных, юбілейных дат, якія маюць дачыненне да гісторыі раёна на працягу таго ці іншага года. Перада мною — «Пуховичский календарь-2018» (нумар за 15 студзеня 2018 года). Каляндар, які складзены болей як тры гады таму. Наўмысна бяру для разгляду ранейшую публікацыю. Каб агледзецца, падсумаваць, якія штуршкі для наступных крокаў па ўшанаванні розных падзей землякам «дапамог» раённы каляндар на 2018 год.

У студзені былі заўважаны наступныя даты: 1-га — 55 гадоў з дня заснавання ў Мар'інай Горцы 5-й асобнай брыгады спецыяльнага прызначэння. 3-га — 55 гадоў саўгасу «Дрычынскі». 15 студзеня — 80 гадоў з дня заснавання Мінскай вобласці. 19-га — 65 гадоў генерал-маёру Валерыю Гайдукевічу (зямляк, выпускнік Шацкай СШ). 22 студзеня — 30 гадоў таму ў Мар'інай Горцы ўведзена ў дзеянне гарадская кацельня № 1 на прыродным газе. 24 студзеня — Дзень гарадскога пасёлка Свіслач. Менавіта ў гэты дзень у 1986 годзе Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР надаў паселішчу статус гарадскога пасёлка.

Люты, сакавік нагадалі пра літаратурна-мастацкія юбілеі 2018 года. 8-га лютага — 90 гадоў з дня нараджэння паэта Уладзіміра Ляпёшкіна (вёска Церабель; 1928—1994). Заслужаны настаўнік БССР. У 1970—1979 гг. — дырэктар выдавецтва «Народная асвета». Паэт фактычна забыты, хаця і пайшоў з жыцця менеў як тры дзесяцігоддзі таму. І мо якраз на Пухавіччыне і варта было б часцей згадваць яго творчыя здабыткі, біяграфію. Тым болей што многія творы Уладзіміра Ляпёшкіна прысвечаны роднай старонцы.

Дык, можа быць, у 2023 годзе, калі ў лютым настане 95-гадовы юбілей паэта, зрабіць выстаўку яго кніг у Рудзенскай гарпасялковай бібліятэцы, у Пухавіцкай раённай бібліятэцы? А яшчэ арганізаваць хаця б часовую персанальную экспазіцыю ў Пухавіцкім раённым краязнаўчым музеі, дзе, між іншым, збіраюць інфармацыю пра пісьменнікаў-землякоў.

Робяць гэта, канешне ж, па меры магчымасцей. А дзе, як не ў родных мясцінах весці літаратурна-краязнаўчы пошук! Многія падказкі магло б даць і дэталёвае вывучэнне, уважлівае перачытанне паэтычных кніг У. Ляпёшкіна — «Ранішнія росы», «Рупнасць», «Роднае», «Вусце», «Перадлецце». Ды і грунтоўны артыкул пра церабельскага творцу патрэбен на старонках «Пухавіцкіх навін». Чаму б яго не заказаць камусьці са сталічных даследчаных літаратуразнаўцаў?

2 сакавіка 2018 года — 100 гадоў з дня нараджэння паэта Алеся Бачылы (1918—1983). За розныя гады, пачынаючы прыблізна з канца 1990-х, на Пухавіччыне зроблена шмат для ўшанавання яго памяці. Генератарам гэтай працы заўжды выступаў дырэктар Пухавіцкага раённага краязнаўчага музея Аляксандр Прановіч. Дзякуючы яго асабістым стасункам, шчыраму сяброўству з нашчадкамі паэта ў Мар'іну Горку трапіла хатняя бібліятэка Алеся Бачылы, істотную частку якой складаюць кнігі з аўтографамі Янкі Брыля, Пімена Панчанкі, Максіма Танка, іншых літаратараў, адрасаваныя паэту з вёскі Лешніца. Гэтая частка бібліятэкі магла стаць асновай для выстаўкі і ў Пухавіцкай кніжніцы — «Кнігі з аўтографамі з бібліятэкі Алеся Бачылы». Чаму б такую экспазіцыю не разгарнуць у сакавіку 2023 года?

У 2018 годзе ў «Пухавіцкім календары…» знайшлося месца згадкам пра юбілеі землякоў — пісьменніка і краязнаўцы Браніслава Зубкоўскага (1938—2015), драматурга Васіля Гарбацэвіча (1893—1985), архітэктара Яўгена Дзятлава (1923—2003), кампазітара Ігара Лучанка (1938—2018), акадэміка медыцыны Арнольда Смеяновіча (1938—2021), скульптара Аляксандра Фінскага (нарадзіўся ў 1953), мастака Хведара Ладуцькі (нарадзіўся ў 1943 годзе). Але ў 2018 годзе маглі б аказацца заўважанымі і іншыя юбілеі — 55 гадоў паэтэсы Вольгі Савасцюк (нарадзілася ў вёсцы Пухавічы ў 1963 годзе); 135 гадоў яўрэйскага літаратурнага крытыка і публіцыста Самуіла Чарных (1883—1955), ураджэнца вёскі Дукора; 130 гадоў яго брата — Данііла Чарных (1888—1959), празаіка, паэта і журналіста, між іншым, аўтара нарыса пра Дукору, выдадзенага ў Таронта ў 1951 годзе; 80 гадоў пісьменніка, журналіста, дзяржаўнага дзеяча Аляксандра Шабаліна (1938—2013), які нарадзіўся ў вёсцы Пухавічы; 65 гадоў гісторыка Мікалая Забаўскага (1953—2017), выхадца з Мар'інай Горкі; 125 гадоў генерал-маёра Евеля Фрыда, які нарадзіўся ў Рудзенску. Наперадзе — 2023 год. І з разлікам на складанне «Пухавіцкага каляндара-2023» ужо сёння можна зрабіць адпаведныя пазнакі па датах, згубленых у 2018-м.

У любым выпадку, нягледзячы на заўвагі, практыка стварэння рэгіянальных календароў памятных дат, юбілеяў, як, у прыватнасці, і практыка публікацыі такога календара ў раённай газеце «Пухавіцкія навіны» — істотны крок у арганізацыі краязнаўчай працы, у яе спалучэнні з выкарыстаннем сродкаў масавай інфармацыі з выхаваўчай работай у школе, у грамадстве ўвогуле. І гэта нельга не ўлічваць.

Сяргей ШЫЧКО

Праз аб'ектыў...

У карціннай галерэі Раённага музейнага комплексу Напалеона Орды, што ў вёсцы Варацэвічы Іванаўскага раёна, да канца лістапада працуе фотавыстаўка Мікалая Стасюка «Палешукі і Палессе».

Спадчына пінскага фатографа-аматара Мікалая Стасюка (1903—1981), які працаваў матарыстам у майстэрнях Пінскай рачной ваеннай флатыліі, захавалася дзякуючы краязнаўцу Аляксандру Навараю.

Паляшук.

У экспазіцыі прадстаўлена каля васьмідзесяці здымкаў 30-х гадоў мінулага стагоддзя. Галоўнай лакацыяй з'яўляецца Пінск і яго наваколле. Сустрэча сяброў, веласпаборніцтвы, нарыхтоўка мёду, упрыгожванне калядной ёлкі, зімняя панарама неафіцыйнай сталіцы Палесся, служба ў арміі, адзначэнне «Дажынак», вясковы пікнік, рандэву закаханых — усё гэта можна пабачыць на здымках фотамастака.

Акрамя таго, наведвальнікі выстаўкі маюць магчымасць разгледзець некаторыя асабістыя рэчы Мікалая Стасюка: дакументы аб заканчэнні пачатковых класаў Пінскага рэальнага вучылішча, «Атлас падрабязных карт тэатраў вайны», негатывы, мандаліну, патэфон і кнігі з асабістай бібліятэкі.

Наталля КРЫВЕЦКАЯ

Подых даўніны

У пачатку жніўня аграгарадок Чарэя, што ў Чашніцкім раёне, сустракаў гасцей. Невялікае мястэчка, якое на пяць гадоў старэйшае за Мінск, мае вельмі цікавую гісторыю. Святочная імпрэза была прысвечана 955-годдзю першай згадкі пра паселішча ў летапісе.

Усё пачалося з раніцы. У адноўленым чарэйскім храме прайшоў малебен. Каля клуба ў цэнтры вёскі разгарнуліся тэматычныя пляцоўкі, шахматна-шашачны турнір, гандаль сувенірамі.

Да ўрачыстага адкрыцця свята госці паспелі пабываць на тэматычнай экскурсіі «Гісторыя зямлі Чарэйскай». Гэтыя мясціны непарыўна звязаны з Сапегамі і Мілашамі, якім на працягу стагоддзяў належала Чарэя.

Падарожжа па славутых мясцінах аграгарадка праводзіла мясцовая бібліятэкарка, краязнаўца Таццяна Казлоўская. Удзельнікі свята наведалі чарэйскае гарадзішча, старажытныя яўрэйскія могілкі, пабывалі на месцы палаца Мілашаў. Больш як сто гадоў таму ў ім з'явіўся на свет вядомы французскі паэт і дыпламат Аскар Мілаш. Экскурсанты мелі магчымасць пагуляць па мілашаўскай алеі, якую ён праславіў у сваіх творах.

Адкрыў свята старшыня раённага Савета дэпутатаў Аляксандр Косаў, які распавёў і пра подзвіг чарэйцаў у гады Вялікай Айчыннай. У невялікім мястэчку нарадзілася два Героі Савецкага Саюза — танкіст Яўген Іваноўскі і лётчык Васіль Дзямідаў. Першы даслужыўся да генерала арміі, займаў пасаду намесніка міністра абароны СССР, у 1980-я ўзначальваў Беларускую ваенную акругу. Другі скончыў воінскую службу ў званні палкоўніка.

Падчас свята.

Ганарацца вяскоўцы і яшчэ адным героем. Легендарны снайпер Леанід Буткевіч, які ўваходзіць у дзясятку найлепшых снайпераў Вялікай Айчыннай, некалькі гадоў вучыўся ў тутэйшай школе. Мясцовыя жыхары захоўваюць памяць пра землякоў, якія мужна змагаліся з фашыстамі. У ганаровым спісе — намеснік камандзіра бельгійскай партызанскай брыгады «За радзіму» Аляксей Дуброўскі, партызанскі доктар Фёдар Раманаў і многія іншыя.

Штогод у аграгарадку бываюць замежныя госці, якія едуць сюды пакланіцца магілам продкаў, пабачыць радзіму Аскара Мілаша, дакрануцца да старажытных руін, адчуць подых сапраўднай даўніны.

Ірына ТОРБІНА, фота аўтара

Бібліятэка на колах

Жоўты мікрааўтобус пяць разоў на тыдзень можна сустрэць на дарогах Бярозаўскага раёна. Многія вяскоўцы ведаюць гэты аўтамабіль як перасоўную бібліятэку.

Бібліятэкар Ала Бык і кіроўца Пётр Салавей.

«Мабільныя» кнігі ён дастаўляе ў 35 вёсак і два гарадскія мікрараёны. Такім чынам абслугоўваецца больш як пяцьсот чытачоў. Гэта пераважна людзі сталага ўзросту і дзеці. Зразумела, кожны чытач падбірае кнігі згодна са сваім густам. Многія выбіраюць творы вядомых беларускіх аўтараў.

Загадчыцай «перасоўнай» бібліятэкі шмат гадоў працуе Ала Бык. Сваю працу Ала Мікалаеўна вельмі любіць і да кожнага чытача ставіцца прыхільна і ўважліва: параіць, якую кнігу альбо часопіс пачытаць, пазнаёміць з навінкамі, раскажа пра цікавых аўтараў, за што кнігалюбы ёй вельмі ўдзячны. Для мабільнай кніжніцы распрацаваны адмысловы графік, які ўключае прыкладна дзесяць маршрутаў. На працягу дня мікрааўтобус наведвае пяць-шэсць вёсак.

Падчас нашай сустрэчы Ала Бык разам з кіроўцам спецмашыны Пятром Салаўём накіроўваліся да чытачоў аддаленых вёсак Батарэя, Касцюкі, Машковічы, Панасавічы, Рагачы. Гэта новыя маршруты, які ўзяла пад сваю апеку гаспадыня кніжніцы на колах.

А яшчэ варта адзначыць, што бібліятэкары раёна праводзяць дабрачынную акцыю «Падары кнігу». Дзякуючы працы мабільнай кніжніцы, ад чытачоў ужо атрымана больш як паўтысячы выданняў.

Іван АСКІРКА, фота аўтара

Простыя рэчы

«Вакол мяне кветкі прыгожа красуюць…»

Жанчына, нават на пасадзе кіраўніка, усё адно застаецца жанчынай — пераўтварае навакольны свет, стварае харство і ўтульнасць, акружае сябе прыгажосцю. Сённяшняя наша размова — з галоўным рэдактарам часопіса «Маладосць» Вольгай Рацэвіч аб яе захапленні — вырабляць кветкі сваімі рукамі.

— Як увогуле ўзнікла захапленне ўпрыгожваць жыццё кветкамі?

— Відаць, проста не магу без іх. Яны паўсюль. Часам гэта нейкае апантанае жаданне акружыць сябе імі. Дома, на працы… На маім рабочым стале з ранняй вясны да позняй восені ў вазе стаіць букет. Пачынаецца ўсё з цюльпанаў, пасля — нарцысы, бэз, язмін, півоні і гэтак далей. Мне падабаецца любавацца кветкамі, вырошчваць іх, збіраць і нават палоць! Па дарозе дадому назіраю за іх жыццём і ў галаве ўжо складаю букет: вось на скошанай траве ляжыць дыван з незабудак, хутка заквітнеюць півоні, а пасля шыпшына і нават лубін. І праз усё лета — ружы.

Часцей збіраю букеты сама. Калі жаданае знаходзіцца ў зоне недасягальнасці, прашу дапамагчы мужа. Ён ведае, што я люблю кветкі, і ідзе па іх. А вось суседка, напрыклад, калі вяртаецца з дачы, заўсёды вязе два букеты: сабе і мне. Апошнім разам гэта быў вялізны ахапак палявых рамонкаў

Фота з асабістага архіва В. Рацэвіч.

(найпрыгажэйшы!), якія выраслі ў яе садзе як пустазелле.

Дарэчы, нават у маім штодзённым вобразе амаль заўсёды прысутнічае квяціста прынт.

Але калі кветак не стае, я стварaю іх сама! І, такім чынам, яны ўсё адно паўсюль! Як у Максіма Багдановіча: «Вакол мяне кветкі прыгожа красуюць…» А яшчэ нядаўна прачытала выказванне, што своечасова падораны жанчыне букет для яе даражэйшы нават за новае футра. Цалкам згодная з аўтарам гэтых слоў.

— Што паслужыла штуршком для вашага захаплення?

— Колькі гадоў таму найлепшая сяброўка падарыла мне набор для творчасці і рукадзелля з фаамірану. Яна ведала, што мяне гэта зацікавіць, бо ў нас агульныя захапленні. А паколькі ў школьныя гады мы разам наведвалі гурток па фларыстыцы, яна была ўпэўненая, што ў мяне ўсё атрымаецца. Я зрабіла некалькі вырабаў, натхнілася гэтым і так пачала ствараць свае ўпрыгажэнні. Гэта брошкі, заколкі і абадкі для валасоў, бывае, кветачкі для дэкору падарункаў. Я іх дару жанчынам нашай сям'і, сяброўкам. І заўсёды абіраю светлыя альбо яркія, насычаныя колеры. Але, прызнаюся шчыра, займаюся гэтым не так часта, як хацелася б.

— Для каго была першая кветка? І якая?

— Першыя вырабы былі крыху нягеглымі. А калі гаварыць пра першы якасны выраб, які змагла насіць сама, то гэта брошка — белая астра. Мы рыхтаваліся да вяселля брата, і я зрабіла яе для сябе. Сваёй работай засталася задаволеная і стварыла ўпрыгажэнні для мамы і дачушкі, у тым жы стылі і колеры, толькі розных памераў і відаў. Мне — брошка, маме — зашчэп, дачушцы — абадок.

— Калі пачынаеце свой выраб, ён ужо дакладна «прамаляваны» ў галаве ці вы не заўсёды ведаеце, што атрымаецца ў выніку? Увогуле, вашы вырабы — абстрактныя кветкі ці канкрэтныя: ружа, ландыш?..

— Калі саджуся за стол і раскладваю перад сабою аркушы фаамірану, нажніцы, клей, бліскаўкі і іншыя патрэбныя рэчы, ужо дакладна ведаю, што канкрэтна павінна атрымацца. І гэта заўсёды арыенцір на вядомую мне кветку. Падчас працы можа мяняцца колькасць вырабаў альбо іх від, колер — ніколі. Вось, напрыклад, прыдумляю кветкі, каб дэкарыраваць пакунак з падарункам, і вырашаю зрабіць у дадатак брошку для імяніннiцы. Бывае, захапіўшыся, сяджу да паўночы. Але гэта не стамляе, бо прыносіць выключна асалоду.

— Ці натхняе вас захапленне кветкамі? А можа, з'явіліся пэўныя якасці характару для вашай асноўнай работы?

— Натуральна, гэта аддыха, хобі, патрэба душы. А, як вядома, правільны і якасны адпачынак уплывае на працаздольнасць.

Што тычыцца асноўнай работы, у мяне ёсць незвычайная калекцыя. Справа ў тым, што я збіраю… памылкі. Дакладней, рэчы з арфаграфічнымі памылкамі. У маім зусім небагатым зборы ёсць каляндарык, асадка, лістоўка, афішка і некалькі газет. Вось такое дзіўнае захапленне! Я не збіраю такія рэчы наўмысна, гэта атрымліваецца выпадкова. «Шукаць» памылкі паўсюль — гэта прафесійнае, доўгі час працавала літаратурным рэдактарам. Сабраныя рэчы з памылкамі я хаваю, нікому не паказваю і ні з кім не абмяркоўваю — рэдактарская этыка. Ды і абмеркаванне такіх выпадкаў не дапаможа прадухіліць з'яўленне памылак у друку. Гэта адбудзецца толькі дзякуючы патрэбнай колькасці рэдактараў і карэктараў у выдавецтвах (рэдакцыях) і выкананню нормаў чыткі для іх.

Гутарыла Яна БУДОВІЧ

зваротная сувязь

Прайсці па мосце лета

Праграма «Літаратурная анталогія» на канале «Культура» Беларускага радыё прапануе старонкі рамана Івана Мележа «Подых навальніцы». У «Радыёбібліятэцы» гучаць эсэ з кнігі Янкі Сіпакова «Зялёны лісток на планеце Зямля». Празаічныя творы кароткіх форм чакаюць слухачоў у праекце «Літаратурныя гісторыі» ў вячэрнім эфіры выхадных.

Змест праграмы «Радыётэатр плюс» у суботу і нядзелю складуць дзве часткі радыёспектакля «Мост» паводле аднайменнай аповесці Івана Шамякіна.

Па выхадных гучыць «Дзіцячы радыётэатр». Гэтым разам яго прыхільнікі пачуюць пастаноўкі «Зелянушка і Кракатушка» Міхася Машары, «Пераблытаныя старонкі» Віктара Ткачэнкі, «Пра дзеда Ая-яй і бабку Оё-ёй» Алега Лойкі і «Не буду прасіць прабачэння» Соф'і Пракоф'евай. Чытанні для маленькіх ладзяцца таксама па буднях у межах праекта «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя». Штовечар а 21:00 гучыць «Вячэрняя казка» на добры сон.

Для аматараў паэзіі па выхадных выходзіць праграма «Прачулым радком», якая гэтым разам прапануе вершы Сымона Блатуна.

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі і навінкамі беларускіх выдавецтваў, а таксама са зместам свежага нумара штотыднёвіка «ЛіМ».

У нядзелю ўвазе слухачоў — праект Навума Гальпяровіча «Сюжэт для вечнасці». Госць эфіру радыёверсіі праграмы «Суразмоўцы», што гучыць у нядзелю і сераду, — паэт, перакладчык, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Мікола Мятліцкі.

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце *www.radiokultura.by* і ў сацыяльных сетках.

ЛіМ КАЛЯНДАР

21 жніўня — 115 гадоў з дня нараджэння Макара Паслядовіча (1906—1984), празаіка, перакладчыка, драматурга.

21 жніўня 90 гадоў спаўняецца Юліі Канэ, крытыку, літаратуразнаўцы. З 1992 г. жыве ў Ізраілі.

21 жніўня 80-годдзе адзначае Уладзімір Машэнскі, дырыжор, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР.

21 жніўня 75-гадовы юбілей святкуе Галіна Міхайлава, жывапісец.

21 жніўня 60-годдзе адзначае Вітаўт Чаропка, празаік.

22 жніўня — 160 гадоў з дня нараджэння Ігната Буйніцкага (1861—1917), акцёра, рэжысёра, тэатральнага дзеяча.

22 жніўня — 110 гадоў з дня нараджэння Іосіфа Лакштанава (1911—1986), акцёра, рэжысёра, заслужанага артыста БССР.

22 жніўня 85 гадоў спаўняецца Ірыне Дзідзічэнцы, артыстцы балета, заслужанай артыстцы БССР.

23 жніўня — 125 гадоў з дня нараджэння Казіміра Бянеўскага (1896—1968), альтыста, заслужанага артыста БССР.

23 жніўня — 120 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Дзяругі (1901—1979), дзеяча самадзейнага мастацтва, заслужанага дзеяча культуры БССР.

23 жніўня — 105 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Мартынава (1916—1998), ваеннага дырыжора, педагога, заслужанага артыста БССР.

23 жніўня — 95 гадоў з дня нараджэння Васіля Петручука (1926—2019), празаіка, заслужанага дзеяча культуры ПНР. Пісаў на беларускай і польскай мовах. Жыў у Беластоку.

23 жніўня 85 гадоў спаўняецца Міхаілу Меранкову, жывапісцу.

24 жніўня — 90 гадоў з дня нараджэння Юрыя Альбіцкага (1931—1996), мастака кіно, жывапісца.

24 жніўня 70-годдзе адзначае Валянціна Маркавец-Бартлава, мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

25 жніўня — 185 гадоў з дня нараджэння Станіслава Акрэйца (1836—1922), беларускага і расійскага журналіста, мемуарыста, белетрыста.

25 жніўня — 95 гадоў з дня нараджэння Васіля Праскурава (1926—1987), празаіка, паэта, публіцыста, заслужанага дзеяча культуры БССР.

25 жніўня — 75 гадоў з дня нараджэння Алега Салтука (1946—2015), паэта.

25 жніўня 70-гадовы юбілей святкуе Нэлі Валынец, мастак у галіне габелена.

26 жніўня — 110 гадоў з дня нараджэння Паўла Дзянісава (1911—2000), музыканта, трубача, педагога, заслужанага артыста БССР.

26 жніўня — 85 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Рубцова (1936—2010), жывапісца.

27 жніўня — 210 гадоў з дня нараджэння Тадэвуша Лады-Заблоцкага (Заблоцкага-Лады) (1811—1847), беларускага і польскага паэта, перакладчыка.

27 жніўня — 115 гадоў з дня нараджэння Сяргея Новіка-Пеюна (1906—1994), паэта, празаіка.

27 жніўня — 75 гадоў з дня нараджэння Анатоля Падгайскага (1946—1982), спевака, заслужанага артыста БССР.

27 жніўня 70-годдзе адзначае Ніна Ламановіч, харавы дырыжор, народная артыстка Беларусі.

27 жніўня 60-гадовы юбілей святкуе Марына Бацюкова, мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, фатограф.

Выходзіць з 1932 года

ЛіМ

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
намеснікі галоўнага рэдактара — 377-99-72, 224-66-74
адказны сакратар — 377-99-72
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 317-20-98
аддзел прозы і паэзіі — 317-20-98
аддзел мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ

Нумар падпісаны ў друк
19.08.2021 у 11.00

Ум. друк. арк. 3,72

Наклад — 653

Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1.
Індэкс 220013

Заказ — 2052

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.
Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.